ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 53 (1587) | Пятніца, 7 ліпеня 1961 года | Цана 4 кап.

ЗА ЦЕСНУЮ СУВЯЗЬ З ЖЫЦЦЁМ

4 ЛІПЕНЯ ў Маскве ў Вялікім Крамлёўскім палацы адкрылася Усесаюзная нарада работнікаў вышэйшай школы. У ёй прымаюць удзел больш як 2500 чалавек—кіраўнікі і выкладчыкі універсітэтаў і інстытутаў, прадстаўнікі саўнаргасаў, міністэрстваў і ведамстваў, партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый ВНУ, прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў краіны, прадстаўнікі вышэйшай школы сацыялістычных краін.

Доўга не змаўкальнымі апладысментамі сустрэлі ўдзельнікі нарады з'яўленне ў ложах Л. І. Брэжнева, А. М. Касыгіна, Н. А. Мухітдзінава, К. А. Фурцавай, М. С. Хрушчова, Г. І. Воранава, В. В. Грышына.

На парадку дня нарады — пытанне аб ходзе перабудовы вышэйшай адукацыі ў СССР.

З вялікім уздымам прысутныя прымаюць прапанову выбраць у ганаровы прэзідыум нарады Прэзідыум ЦК КПСС на чале з таварышам М. С. Хрушчовым.

Затым слова атрымлівае член *Прэзідыума ЦК КПСС першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін. Ён зачытвае прывітанне нарадзе ад ЦК* КПСС і Савета Міністраў СССР, у якім гаворыцца:

«Дарагія таварышы!

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савет Міністраў СССР горача вітаюць вас і ў вашай асобе прафесараў, *выкладчыкаў, студэнтаў і* ўсіх работнікаў вышэйшай школы.

Усесаюзная нарада работнікаў вышэйшай школы праходзіць напярэдадні XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Савецкі народ аднадушны ў сваім імкненні дастойна сустрэць гэту гістарычную падзею новымі працоўнымі перамогамі.

XXII з'езд КПСС падвядзе вынікі вялікім дасягненням савецкага народа і прыме новую Праграму партыі—праграму будаўніцтва камунізма ў нашай краіне.

Камуністычная партыя і Савецкі ўрад нязменна ўдзяляюць вялікую ўвагу развіццю вышэйшай адукацыі. Перамога Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі ўпершыню ў сусветнай гісторыі паставіла на службу народу ўсе даброты навукі і тэхнікі, усе завоевы культуры. Вялікі заснавальнік Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы Ул. І. Ленін вучыў, што для пабудовы камуністычнага грамадства неабходна авалодаць ведамі ўсіх тых багацяў, якія выпрацавала чалавецтва на працягу ўсёй гісторыі свайго развіцця.

За гады Савецкай улады наша вышэйшая школа атрымала выключна хуткае развіццё. Яна падрыхтавала велізарную армію інжынераў, аграномаў, урачоў, настаўнікаў і іншых спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры. Па выпуску інжынераў наша краіна займае першае месца ў свеце. Паспяхова ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў інтэлігенцыі ва ўсіх саюзных рэспубліках Савецкага Саюза.

Прафесары і выкладчыкі вышэйшай школы ўзбройваюць нашу моладзь веданнем законаў развіцця прыроды і грамадства, уменнем выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы, выхоўваюць яе ў духу *ўсеперамагаючых* ідэй марксізма-ленінізма, у духу савецкага патрыятызму і пралетарскага *інтэрнацыяналізму.*

Падрыхтаваныя ў вышэйшай школе спецыялісты адыгралі вялікую ролю ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, у навукова-тэхнічным прагрэсе нашай вялікай краіны. Мы маем цяпер высокакваліфікаваныя кадры па ўсіх галінах ведаў, якія здольны паспяхова вырашаць самыя складаныя задачы развіцця народнай гаспадаркі.

Вышэйшая школа выхавала шматлікі атрад навуковых работнікаў, якія праслаўляюць сваёй працай і талентам сацыялістычную Радзіму, што ідзе на чале прагрэсу ўсяго чалавецтва. Прафесары і выкладчыкі вышэйшай школы ўнеслі вялікі ўклад у вырашэнне навуковых праблем, якія маюць велізарнае значэнне ў развіцці навукі, тэхнікі, эканомікі і культуры. У дасягненні выдатных поспехаў Савецкага Саюза, у даследаванні касмічнай прасторы, у выкарыстанні атамнай энергіі ў мірных мэтах, у стварэнні рэактыўнай тэхнікі, у развіцці электронікі і ў іншых галінах навукі і тэхнікі вялікая роля належыць нашай вышэйшай школе.

Разгорнутае будаўніцтва камуністычнага грамадства ў СССР ставіць перад вышэйшай школай новыя велізарныя задачы ў справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, у развіцці навукі, тэхнікі і культуры.

Прафесары і выкладчыкі, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя *арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў павінны накіраваць* усе свае намаганні на выкананне Закону аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР. Галоўнае ў дзейнасці вышэйшай школы на новым этапе заключаецца ў тым, каб павысіць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове спалучэння навучання з грамадска карыснай працай.

Вышэйшая школа заклікана даваць глыбокія тэарэтычныя і практычныя веды студэнтам, прывіваць любоў да працы і навыкі грамадскай дзейнасці. Маладыя спецыялісты абавязаны ў дасканаласці авалодаць найноўшымі дасягненнямі айчыннай і сусветнай навукі і тэхнікі, добра ведаць практыку справы, быць палымянымі *змагарамі за пабудову камуністычнага грамадства.*

Далейшае развіццё і ўдасканальванне вышэйшай школы патрабуе паляпшэння падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў, здольных яшчэ вышэй узняць сцяг айчыннай навукі. Абавязак кожнага выкладчыка вышэйшай школы —пастаянна павышаць свае тэарэтычныя і практычныя веды і педагагічнае майстэрства.

Неабходна шырэй развіваць навукова-даследчую работу ў вышэйшых навучальных установах, накіраваную на вырашэнне буйных тэарэтычных праблем і практычных *задач далейшага развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі і* культуры. Абавязак вучоных ВНУ, разам з усімі вучонымі краіны, у садружнасці з работнікамі вытворчасці, заключаецца ў тым, каб выяўляць новыя прыродныя рэсурсы, узбройваць народную гаспадарку новымі тэарэтычнымі вывадамі і адкрыццямі, якія паскараюць тэхнічны прагрэс, хутка ўкараняць вынікі навуковых даследаванняў у вытворчасць, у *жыццё.*

Савецкі народ вырашае цяпер важную задачу па далейшаму ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці. Ганаровы абавязак работнікаў вышэйшай школы—прыняць актыўны ўдзел у выкананні *гэтай грандыёзнай задачы. Неабходна,* каб вучоныя ВНУ распрацоўвалі пытанні эканомікі і арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці ў дастасаванні да розных зон краіны, пытанні павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, далейшага развіцця жывёлагадоўлі, комплекснай механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Прафесары і выкладчыкі грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў абавязаны глыбей вывучаць і тэарэтычна абагульняць практыку камуністычнага будаўніцтва, грамадскія з'явы і заканамернасці сучаснай эпохі. Усім работнікам вышэйшай школы трэба весці непрымірымую барацьбу за чыстату марксісцка-ленінскай тэорыі, супраць рэвізіянізму, дагматызму, сектанцтва, *супраць буржуазнай ідэалогіі.*

Прафесары і выкладчыкі закліканы несці свае веды ў масы працоўных, быць актыўнымі прапагандыстамі дасягненняў навукі і тэхнікі, прымаць непасрэдны ўдзел у павышэнні культурнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню народа.

Няма сумнення ў тым, што работнікі вышэйшых навучальных устаноў, разам з усім савецкім народам, сустрэнуць XXII з'езд *Камуністычнай партыі Савецкага* Саюза новымі поспехамі ў падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і ў развіцці навукова-даследчых работ.

ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што работнікі вышэйшай школы ўнясуць дастойны ўклад у будаўніцтва камуністычнага грамадства ў нашай краіне».

* * *

З дакладам аб ходзе перабудовы работы вышэйшых навучальных устаноў у адпаведнасці з Законам аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР выступіў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюцін.

Каля 30 юнакоў і дзяўчат займаюцца ў Мінскім цэнтральным аэраклубе. Яны авалодваюць майстэрствам лётнай і парашутнай справы. Гэта — рабочыя і служачыя нашай сталіцы, якія сумяшчаюць працу са спортам смелых. На здымку вы бачыце прадзільшчыцу камвольнага камбінату Нэлу Гінтаву перад палётам на планеры.

Фота Ул. Крука.

Што хвалюе старшыню

З блакнота журналіста

— Вы пытаеце, што стрымлівае больш шпаркае развіццё гаспадаркі? Што перашкаджае? Якія ў старшыні калгаса ёсць прэтэнзіі і да каго? Прызнацца, мне рэдка прыходзіцца чуць такія пытанні ад вашага брата, газетчыка. Звычайна карэспандэнты, як толькі прыязджаюць, пачынаюць пытаць аб ураджаях, распытваюць, колькі даём прадукцыі на сто гектараў зямлі, падлічваюць яе сабекошт. Безумоўна, усё гэта важна. Аб гаспадарцы і яе кіраўніках мяркуюць па выніках работы. І гэта правільна. Але ж разам з тым пацікаўцеся, як былі дасягнуты тыя ці іншыя вынікі, і калі яны недастатковыя, дык чаму?

Мікалай Іванавіч Малышаў глянуў на гадзіннік:

— Ого! Ужо дзевяць гадзін, — сказаў ён. — Час брацца за тэлефон. Прашу прабачэння...

Ён зняў трубку, папрасіў тэлефаністку звязаць яго з раённай канторай «Гандальмаш» і ўзрушана загаварыў па тэлефоне:

— Мне таварыша Бежануцу... Гэта Рыгор Іванавіч?.. Добры дзень! Малышаў турбуе. З калгаса «17 верасня». Рыгор Іванавіч! Як з нашай заяўкай на запчасткі? Больш двух месяцаў, як ляжыць у вас. Колькі ж чакаць?.. Што? Нічога не выходзіць? А што нам рабіць? Два трактары стаяць. Да аднаго муфта счаплення патрэбна, да другога магнета. Восем аўтамашын без пакрышак... Што вы параіце? *Выкручвацца самому?* Ага! Ну, дзякую за добрую параду. А вы чым займаецеся? Перабудовай? Так-так. Бывайце...

Старшыня калгаса паклаў трубку...

— Чулі! Магу я пасля гэтага называць іх «Белсельгастэхнікай», каб не кампраметаваць нядаўна створанае аб'яднанне? Не ведаю, як дзе, але ў нашым Мядзельскім раёне аддзяленне «Белсельгастэхнікі» — гэта пакуль што толькі замена назвы. Тыя ж самыя людзі працуюць на тых жа месцах. Пасады, праўда, называюцца інакш. Былы дырэктар РТМС Капуста цяпер упраўляючы раённага аддзялення «Белсельгастэхнікі», а яго намеснікам — Бежануца, былы дырэктар Мядзельскай канторы «Гандальмаш», якая існавала пры РТМС. Апошні і працягвае выконваць тыя ж абавязкі. Не падумайце, што я супраць іх асабіста. Я толькі хачу падкрэсліць: сапраўднай перабудовы яшчэ не адбылося.

Вы можаце сказаць, што было б наіўна чакаць нейкага цуда з першых жа дзён рэарганізацыі службы тэхнічнага забеспячэння і абслугоўвання сельскай гаспадаркі. У мяне гэтыя запчасткі во дзе сядзяць! — Мікалай Іванавіч тыцнуў сябе ў грудзі.—Папрацавалі б вы старшынёй калгаса хоць год, дык адчулі б, што азначае праблема запасных частак.

На пошукі іх іншы раз у нас цэлыя тыдні ідуць — іншыя калгасныя справы ў гэты час адыходзяць на другі план. Перабудова, рэарганізацыя — справа, зразумела, не простая. Праблема вырашаецца ў маштабе цэлай краіны. Свае прэтэнзіі я адрасую тым, хто *марудзіць з сапраўднай перабудовай,* валыніць і не робіць таго, што можна было даўно ўжо зрабіць на месцы, сваімі сіламі.

У гэты час у пакойчык старшыні, дзе мы гутарылі, заглянуў невысокі малады мужчына ў зашмальцаваным камбінезоне. Заўважыўшы яго на парозе, Малышаў затрывожыўся.

— Што, таварыш Дубавік? Паломка?

— Ага, Мікалай Іванавіч, стаім, — уздыхнуў механізатар, гатовы выслухаць любыя папрокі.— Трэснула паўвось культыватара.

Малышаў узяўся быў за тэлефонную трубку, потым махнуў рукой і стаў уважліва перагортваць сваю запісную кніжку.

— Тут у мяне поўны ўлік усёй калгаснай тэхнікі, — сказаў ён.— Усё запісана: дзе што знаходзіцца, што паламалася, што адрамантавана. — І, павярнуўшыся да трактарыста, распарадзіўся: — Едзь у другую брыгаду. Там днямі выйшаў са строю такі ж культыватар, але паўвось уцалела. Пераставіш.

Механізатар у радасным настроі выйшаў. Старшыня заўважыў:

— Вось так і выкручваемся.

— Вы ведаеце, — працягваў старшыня,— у гарачы час сяўбы ці ўборкі ўраджаю нашы механізатары працуюць у дзве змены, а іншы раз і ўночы. Усе ў калгасе з шасці — сямі гадзін раніцы ўжо на нагах. А як гандальмашаўцы? У іх ніякіх змен, па-ранейшаму працуюць без усялякага напружання. Пачынаюць у дзевяць раніцы і канчаюць у пяць гадзін вечара. Калі што здарыцца, скажам, з трактарам і прыедзеш да іх без пяці пяць — нікога ўжо не знойдзеш. Хоць і ёсць запасныя часткі на складзе — усё роўна калгасны трактар альбо камбайн будзе стаяць да наступнага дня. А ці падлічыў хто, колькі каштуюць гэтыя прастоі? Бывае так: камбайн прастаіць суткі, а то і двое, пакуль ідуць пошукі патрэбнай дэталі. А калі яе, нарэшце, знойдуць — якраз сапсуецца надвор'е. *У выніку вялізныя страты.*

— А хочаце ведаць з-за якой дэталі? — Мікалай Іванавіч адчыніў шуфляду стала і дастаў адтуль некалькі невялікіх гумавых кольцаў. — Называюцца ўшчыльняльныя кольцы цыліндраў жаткі камбайна. Пісалі пісьмо аж у Таганрог на камбайнавы завод. Прыслалі ў канверце некалькі штук. Як бачыце, яны штампаваныя і каштуюць капейкі. Дзе-небудзь іх валялася процьма, а ў нас не было. Кінуліся туды-сюды — нідзе няма! Галоўны інжынер «Гандальмаша» Смятанка прапанаваў скарыстаць старыя пацёртыя кольцы. «Як?» — запыталі мы. «Абкручвайце іх для ўшчыльнення тонкай гумай» Паспрабавалі мы тыя гумкі, і нічога не выйшла.

Тут зноў перапынілі расказчыка. Адзін з трактарыстаў калгаса — Яцына — паведаміў, што з-за паломкі храпавіка выйшаў са строю пяцікорпусны плуг у чацвёртай брыгадзе.

— Гэта ўжо трэці, — канстатаваў старшыня, нешта занатоўваючы ў запісной кніжцы. — Што будзем рабіць? — павярнуўся ён да механізатара.

Трактарыст паціснуў плячыма. Старшыня пачаў званіць у Мядзель да гандальмашаўцаў.

— Храпавікоў няма і невядома, калі будуць, — адказалі яму.

Малышаў на хвіліну адарваўся ад трубкі і загадаў перадаць механіку калгаса, каб збіраўся ў камандзіроўку — у Маладзечна і Мінск — на пошукі «гэтых чортавых храпавікоў». Потым яго размова з «Гандальмашам» праходзіла прыкладна так: «Скажыце, а лямпачкі для аўтамашын ёсць? Толькі сігнальныя. Так-так. Як абстаіць справа з кіслатой акумулятараў? Няма! Электраправодку для трактараў прывезлі? Не? А як жа працаваць ноччу без асвятлення? Гэта для вас «дзень вялікі». А нам, бывае, і ночы мала... Што ж у вас ёсць? Можа, абутак паявіўся для аўтамашын? Кажаце, смешнае пытанне? Ну, смейцеся, а мне не да смеху... Раіце вулканізаваць старыя пакрышкі і камеры? Дзякуем. Ведаем без вас».

— З гэтай вулканізацыяй анекдатычная гісторыя выйшла, — расказаў Мікалай Іванавіч, калі закончыў тэлефонную размову. — Неяк сабралі мы дзесяткі два пакрышак і павезлі ў Мінск на шынна-рамонтны завод.

— Ну, нічога. Добра, што хоць адрамантавалі, — думалі мы. Змянілі слабыя пакрышкі на колах — надзелі абноўленыя і паехалі. Не праехалі і паўсотні кіламетраў—чуем нешта ляскае. Спыніліся. Глядзім: лоскут адклеіўся на адной з пакрышак! «Бракаробы!» — злуецца вадзіцель, адразаючы лоскут лапіка. Едзем далей, і — зноў знаёмы лёскат! Так паўтаралася многа раз, пакуль ад «рамонту» не засталося і слядоў.

Размова зноў увайшла ў сваё рэчышча. Малышаў вярнуўся да незакончанай думкі аб магчымасці і неабходнасці неадкладна палепшыць работу «гандальмашаўцаў».

— Яны могуць і павінны дапасаваць сваю работу да патрэб працаўнікоў сельскай гаспадаркі! — з запалам гаворыць Мікалай Іванавіч. — Дзяжурства ля тэлефона маглі б устанавіць? Магліб і перад пачаткам рабочага дня і пасля яго. Трэба, каб у кожны момант з сямі гадзін раніцы да дзевяці вечара можна было дазваніцца, паведаміць, якая запасная частка каму патрэбна.

Можа, усё, што я кажу вам, здасца дробяззю? Няхай сабе так. Але гэтыя дробязі часта з'яўляюцца прычынай дужа прыкрых з'яў.

Малышаў на развітанне сказаў:

— Усё, што вы тут пачулі, няхай і будзе адказам на ваша пытанне.

Старшыня спяшаўся. Яго чакалі дзесяткі іншых неадкладных спраў.

М. РАЖКОЎ.

Мядзельскі раён.

НА БЛАКІТНЫХ ДАРОГАХ

Лётчык чуе ў мікрафоне кароткую знаёмую каманду:

— Дазваляю ўзлёт!

Зашумацелі чатыры маторы, узняўшы пад крыламі пыл, і цяжкі самалёт, вагою ў 54 тоны, лёгка бяжыць па бетаніраванай дарожцы. Вось ён адарваўся ад зямлі і, развярнуўшыся, узяў курс на поўдзень. У самалёце 80 пасажыраў. Праз гадзіну яны будуць у Львове...

Рэйс самалёта звычайны, будзённы. Старшы змены Мінскага аэравакзала Н. Маханькоў расказвае аб ім, нібы аб тралейбусе, які выходзіць з парка. І не ўсім вядома, што падрыхтоўка кожнага паветранага рэйса — работа вялікая, складаная, у якой удзельнічаюць інжынеры, тэхнікі, матарысты, сіноптыкі і нават кулінары.

Калі падяліць колькасць пасажырскіх вылетаў з Мінскага аэрапорта на гадзіны, атрымліваецца, што амаль безупынна на працягу сутак з аэрадрома ўзнімаюцца самалёты. Адны ляцяць у далёкія рэйсы — Адлер, Сімферопаль, другія — бліжэй: Маскву, Ленінград, Львоў, Рыгу. Трэція звязваюць сталіцу з абласнымі і раённымі цэнтрамі. Адпаведна з гэтым на блакітныя трасы выходзяць розныя самалёты. Тут камфартабельныя прыгажуны «АН-10» і паветраныя аўтобусы «ІЛ-14», і нястомныя старэнькія «АН-2». Самалёты вылятаюць раніцаю, і ўдзень, і ноччу. Яны вязуць камандзіровачных, падарожнікаў, проста пасажыраў, якія спяшаюцца да сваякоў ці па асабістых справах. Шмат пасажыраў перавозіць штодзень Мінскі аэрапорт.

Сёлета Мінск стаў горадам міжнародных паветраных сувязей. Праз сталіцу Беларусі праходзяць трасы Ленінград — Будапешт, Масква — Берлін, Масква — Варшава. Амаль кожны дзень у Мінскім аэрапорце робяць прыпынкі турысты Англіі, ЗША, Нігерыі, Ганы, Францыі, Аўстраліі.

Будучыня аэравакзала сталіцы рэспублікі яшчэ большая. У хуткім часе з Мінска ў Адлер і Сочы пачне курсіраваць лайнер «АН-10». Новыя паветраныя лініі звяжуць Мінск з гарадамі Украіны, Расійскай Федэрацыі і Прыбалтыкі. Павялічыцца колькасць унутраных ліній.

Літаратурны вечар

У Капыльскім раённым Доме культуры адбыўся вечар сустрэчы членаў літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі раённай газеты «Калгаснік Капыльшчыны» з грамадскасцю раённага цэнтра.

З дакладам аб літаратурных традыцыях выступіла сакратар літаб'яднання Ганна Ілюкевіч. Член літаб'яднання настаўнік Цімкавіцкай сярэдняй школы Іван Аляксандраў прачытаў урывак з апавядання. Пачынаючы паэт настаўнік Навасёлкаўскай сярэдняй школы Мікалай Макарчук прачытаў свае новыя сатырычныя вершы.

З чытаннем вершаў выступілі члены літаратурнага аб'яднання настаўнік Аляксандр Бярновіч, рабочы Анатоль Казлоўскі, калгаснік Аляксандр Цюрыкаў.

На літаратурным вечары прысутнічаў і прачытаў свае вершы беларускі паэт Адам Русак.

М. СЯЎРУК.

Зноў у Мінску

Учора спектаклем «Салдаты» («Дарогаю жыцця») пачаў свае гастролі ў Мінску Гродзенскі драматычны тэатр.

Гэта — не першыя нашы гастролі ў сталіцы рэспублікі. Па добраму звычаю, усе абласныя тэатры рэспублікі раз у два—тры гады выступаюць са сваімі спектаклямі перад мінчанамі. Наш тэатр апошні раз быў у Мінску два гады назад. Тады мы паказалі «Чайкі над морам», «Чаму ўсміхаліся зоркі», «Улада цемры» і інш. Цёплы прыём гледача і высокая ацэнка сталічным друкам раду нашых спектакляў і асобных акцёрскіх работ былі сапраўднай узнагародай за нашу працу, а справядлівая, добразычлівая крытыка недахопаў вызначыла далейшыя творчыя задачы.

І вось мы зноў у Мінску. Што ж мы пакажам? У першую чаргу — п'есы пра нашых сучаснікаў. Нашы гледачы пазнаёміліся з імі ўжо ва ўчарашнім спектаклі.

Барацьба з бандытамі, цяжкасці першай пяцігодкі, суровая пагранічная служба і трагедыя першых дзён вайны, боль ваенных пакут і горыч разлук, — такія *старонкі жыцця герояў* гэтага спектакля.

«Эх, як гэта добра: *змагацца* за тое, што дорага, за тое, што патрэбна ўсім народам!» — гаворыць старшыня калгаса Ягор Ушакоў з нашага спектакля «Дзеля сваіх блізкіх» па п'есе *Лаўрэнцьева. Гэта — другая наша прэм'ера ў Мінску. Героі* спектакля сапраўды змагаюцца за тое, што патрэбна ўсім людзям; яны па-дзяржаўнаму і творча вырашаюць пытанні далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі.

Барацьба савецкіх людзей са сквапнасцю, мяшчанствам, гультайствам адлюстравана ў трэцім спектаклі нашага тэатра — «Чужы дом» украінскага драматурга Міколы Заруднага.

Вясёлая, займальная камедыя ленінградскіх драматургаў Смірновай і Крайдаль «У сябе ў палоне», спектакль «Ад шчодрасці сэрца», які раскрывае выдатныя чалавечыя якасці, спектакль «Юнацтва маё» аб станаўленні характару маладога чалавека, аб пераймальнасці традыцый — дапаўняюць рэпертуар аб нашых сучасніках, аб іх выдатных справах і барацьбе за новае, камуністычнае.

Адначасова тэатр мае ў сваім рэпертуары спектаклі, якія расказваюць пра норавы і звычаі капіталістычнага свету, ілжывасць буржуазнай маралі, антынародную сутнасць заходняй «дэмакратыі». Гэта «Тапаз» — п'еса французскага драматурга М. Паньоля і «Тры таварышы» — інсцэніроўка вядомага рамана Рэмарка.

Штогод наш тэатр ставіць п'есы з рускай класікі. Так, пасля «Улады цемры» Л. Талстога ў мінулым годзе намі былі пастаўлены «Тры сястры» Чэхава, а сёлета — камедыя А. Астроўскага «Без віны вінаватыя», якую мы пакажам мінчанам.

За два гады, што аддзяляюць нас ад мінулых гастролей, вельмі змяніўся і наш творчы калектыў. Апроч вядомых ужо мінчанам заслужаных артыстаў рэспублікі Кавязінай, Астанкавай, Кімберг, артыстаў Панкрат, Паповай, Іёнава, Бірычэўскага, Грачыскага, Шашкіцай і інш., перад гледачамі Мінска выступяць артысты *Салавей, Корн,* Аляксандраў, Маёраў, Селязнёва, Каліна і інш. У новых ролях выступяць маладыя артысты Дубаў і Гаракец, свае першыя работы пакажуць мінчанам леташнія выпускнікі Мінскага тэатральнага інстытута Кавязіна і Міхарскі.

І. ПАПОЎ,
заслужаны артыст БССР, галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.

Падзеі, факты, навіны

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

Кінафільмы студыі «Беларусьфільм» добра вядомы гледачам краіны. З лепшымі з іх пазнаёміўся і замежны глядач. Таму зразумела павышаная цікавасць да новых работ беларускіх кінематаграфістаў, да іх творчых задум.

Днямі ў Цэнтральным Доме кіно ў Маскве адбыўся творчы вечар работнікаў кіно нашай рэспублікі. Прысутныя з цікавасцю слухалі аднаго з старэйшых рэжысёраў Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР Ю. Тарыча і заслужанага дзеяча мастацтва БССР рэжысёра Л. Голуба, якія расказалі аб гісторыі беларускага кіно, фільмах, якія ў бліжэйшы час выйдуць на экраны.

Затым адбыўся прагляд новых карцін, створаных студыяй «Беларусьфільм» — другой серыі мастацкага фільма «Першыя выпрабаванні» (па матывах трылогіі Я. Коласа «На ростанях»), дакументальнай карціны «Песня працы», кіназборніка «Апавяданні пра юнацтва».

ЭКСПЕДЫЦЫЯ МУЗЕЯ РЭВАЛЮЦЫІ СССР У БЕЛАРУСІ

У Беларусі закончыла работу навуковая экспедыцыя Дзяржаўнага музея рэвалюцыі СССР. Сабраныя матэрыялы пакажуць шлях, пройдзены Беларускай ССР ад XXI да XXII з'ездаў КПСС.

Экспедыцыя пабывала на трактарным, аўтамабільным і падшыпнікавым заводах, заводзе аўтаматычных ліній. Макеты і мадэлі машын і станкоў гэтых прадпрыемстваў, а таксама матэрыялы аб сацыялістычным спаборніцтве, брыгадах камуністычнай працы паступяць у экспазіцыю музея.

Рад экспанатаў дазволіць паўней адлюстраваць навуковую дзейнасць асобных інстытутаў АН БССР. Міністэрства сельскай гаспадаркі рэспублікі перадало ўзоры сельскагаспадарчых культур, у тым ліку гібрыдных, якія ўкаранёны на калгасных і саўгасных палях Беларусі. Удзельнікі экспедыцыі пабывалі таксама ў перадавых калгасах.



Вялікія работы разгарнуліся па збудаванню адной з галоўных магістралей сталіцы — праспекта імя Леніна, які злучыць цэнтр горада з месцам адпачынку мінчан — Мінскім возерам. Прыходзяць сюды і будучыя мастакі. Яны робяць замалёўкі, эцюды, пішуць карціны.

НА ЗДЫМКУ: студэнт мастацкага факультэта Тэатральна-мастацкага інстытута В. БЕЛЯНІЦКІ піша карціну на месцы будучай магістралі.

Фота Я. Мельцярзона.

АГЛЯД КНІГАРНЯЎ

У рэспубліцы пачаўся грамадскі агляд магазінаў Белкнігагандлю.

У перыяд агляду на прадпрыемствах, буйных будоўлях намячаецца адкрыццё магазінаў і кіёскаў па продажу літаратуры на грамадскіх асновах, арганізацыя тэматычных выставак літаратуры.

Кніжным магазінам, якія выканаюць умовы агляду і даб'юцца найбольш высокіх паказчыкаў у рабоце, будзе прысвоена назва «Лепшы кніжны магазін Міністэрства культуры БССР» з уручэннем вымпела.

Семінар маладых мастакоў

У маляўнічай мясцовасці каля возера Нарач адбыўся семінар самадзейных мастакоў. Яго правёў Мінскі абласны Дом народнай творчасці. На працягу васьмі дзён каля дваццаці чалавек *рабілі замалёўкі, пейзажы,* накіды. Добрых поспехаў дамагліся Ф. Хадасоўскі (Мінск), Л. Літвінаў (Салігорск), І. Хведаровіч (Слуцк), А. Аляксееў (Маладзечна).

ЗАВОЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Крычаўская гарадская бібліятэка і рэдакцыя раённай газеты «Шлях сацыялізма» праводзяць завочную канферэнцыю па тэме: «Вучыцца працаваць і жыць па-камуністычнаму».

Чытачы дасылаюць свае выказванні ў рэдакцыю раённай газеты. Многія з іх друкуюцца на яе старонках.

ЛІТОЎСКІ ВУЧОНЫ ДАСЛЕДУЕ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Днямі ў Вільнюскім дзяржаўным універсітэце імя В. Капсукаса абаранялася цікавая кандыдацкая дысертацыя, якая прыцягнула ўвагу і беларускіх філолагаў. Дысертант, супрацоўнік гэтага ж універсітэта Антон Канстанцінавіч *Антановіч* ужо многа год вывучае мову помнікаў старой беларускай пісьменнасці. У друку з'яўляліся яго працы, прысвечаныя мове «Судзебнай (актавай) кнігі Каўнаскага земскага суда 1566—1567 гг.». Аўтар указваў, што ў 16—17 стагоддзях беларуская мова ўжывалася ў якасці дзяржаўнай і на тэрыторыі этнаграфічнай Літвы. Пры такіх умовах на мове помніка не маглі не адбіцца і асаблівасці мясцовай літоўскай мовы.

Літоўскія лінгвісты, а таксама афіцыяльны апанент прафесар Беларускага універсітэта М. А. Жыдовіч высока ацанілі даследаванне А. К. Антановіча. Яны падкрэслівалі, што мова помнікаў старой *беларускай пісьменнасці вывучана* яшчэ вельмі слаба, хаця толькі ў *бібліятэцы* Вільнюскага універсітэта захоўваецца каля 120 тысяч лістоў на старажытнай беларускай мове. Але не было ніводнай спецыяльнай работы, прысвечанай мове помнікаў, якія ўзніклі на тэрыторыі этнаграфічнай Літвы. А. К. Антановіч з'явіўся тут першаадкрывальнікам.

М. АДАМАЎ.

СЯРОД КНІГ

ШЧЫРА, МЕЛАДЫЧНА

З цікавасцю разгортваеш кожны новы зборнік песень. А са зборнікам Ул. Алоўнікава, які нядаўна выйшаў у нашым выдавецтве, асабліва цікава было пазнаёміцца, бо яго даўно чакаюць аматары музыкі, самадзейныя спевакі-салісты і харавыя калектывы. Усе яны ведаюць кампазітара Ул. Алоўнікава і спадзяюцца на яго талент.

Новы зборнік песень кампазітара «Даў слова — стрымай!» апраўдвае гэтыя надзеі. У яго ўключаны дванаццаць песень, розных па тэматыцы, па настрою, у большасці сваёй яркіх па меладычнай мове.

Тэма грамадзянскага абавязку, вобраз савецкага чалавека — нашага сучасніка, яго думкі, справы, высокі ўзлёт мары — гэта найбольш характэрнае для песеннай творчасці кампазітара. Але перш за ўсё хочацца звярнуцца да песень, у якіх Ул. Алоўнікаў працягвае распрацоўваць тэму Айчыннай вайны.

У дні, калі ў нашай краіне шырока адзначалася 20-годдзе з дня пачатку Вялікай Айчыннай вайны, па радыё прагучалі песні Ул. Алоўнікава. Удзельнік вялікай народнай барацьбы, кампазітар яшчэ даўно пачаў работу над цыклам песень пра падзеі ваенных год. Хто не ведае яго песень пра Заслонава, генерала Даватара, Гастэлу, Івача Сіўко, пра Брэсцкую крэпасць, «Лясную песню»? Кампазітар застаўся верны сваёй тэме. У зборніку ёсць «Песня пра Карбышава» на словы А. Лазнявога. Кампазітар стварыў вобраз бясстрашнага і мужнага чалавека.

Тэме вайны прысвечана яшчэ адна песня зборніка — «Партызанская паходная» на словы К. Кірэенкі. Для яе музыкі характэрны выразны рытм фартэпіяннага суправаджэння, якое льецца адзіным, бесперапынным патокам. Выразнасць, маршавасць уласцівы і для напеву, простага і лёгка запамінальнага. Вельмі цікавая песня «Вартавы» (словы Е. Лось). Апавяданне аб маладым пагранічніку, аб яго нялёгкай службе на граніцы пададзена ў выглядзе няхуткага, стрыманага марша. Але слухачы ўспрымуць песню і як шчырае, шчодрае, лірычнае апавяданне, і як паэтычны малюнак цудоўнай роднай прыроды, і як выяўленне патрыятычнага пачуцця любві да Радзімы.

Самае ж вялікае месца ў зборніку займае цыкл «Мае сучаснікі». Адна з песень гэтага цыкла «Аршанская старонка» (словы А. Русака) — успамін людзей натхнёнай працы, былых партызан пра легендарнага героя Заслонава. Мелодыя простая, рэльефная і выразная, яна лёгка запамінаецца. Аднак у «Аршанскай старонцы» адчуваюцца і інтанацыі ранейшых песень кампазітара.

На верш А. Бачылы напісана песня «Даў слова — стрымай!». Шырокая, распеўная мелодыя запеву вельмі энергічная. Яна змяняецца чоткім мужным прыпевам, музыка якога ўзмацняе настрой упэўненасці ў здзяйсненні цудоўных спраў.

У новы цыкл уваходзіць і «Песня аўтазаводцаў». Яна была напісана кампазітарам спецыяльна па просьбе моладзі Мінскага аўтамабільнага завода. Ул. Алоўнікаў прынёс яе на завод у верасні мінулага года. З таго часу моцная дружба звязала яго з моладдзю гэтага буйнейшага прадпрыемства рэспублікі. Кампазітар вырашыў дапамагчы моладзі авалодаць музычнай культурай. Ён узяў шэфства над мастацкай самадзейнасцю аўтазавода. Сустрэчы з рабочымі далі кампазітару вельмі многа. Жыццё, працоўныя будні шматтысячнага калектыву ўзбагацілі яго творчую палітру. Вось тады і ўзнікла ў Ул. Алоўнікава задума стварыць цыкл «Мае сучаснікі», у якім ён вырашыў адлюстраваць багаты душэўны свет людзей працы, іх высокія маральныя якасці. Свой цыкл песень кампазітар прысвячае XXII з'езду КПСС.

На заводзе, дзе многа таленавітай моладзі, Ул. Алоўнікаў знайшоў паэта. Гэта сталявар Казімір Гляйхенгаус. У садружнасці з ім былі напісаны дзве песні. «Спяём, сябры, спяём!» — гэта песня, напісаная паводле слоў кампазітара, не толькі і нават не столькі для выканання на сцэне, колькі ў быту, у час адпачынку, у кругу таварышаў. Сапраўды, песня вельмі сардэчная, задушэўная, выразная і яркая па меладычнай мове.

Напісаная на словы К. Гляйхенгауса песня «Недзе ў пасёлку» — пяшчотная, пранікнёна лірычная.

Цыкл «Мае сучаснікі» у кампазітара папаўняецца новымі песнямі. Створаны таксама песні «Пакаленні» на словы П. Панчанкі, «Салігорская шахцёрская» на словы А. Русака.

Але вернемся да зборніка. Некаторыя песні, якія ўваходзяць у яго, ужо вядомы ў рэспубліцы. Самая папулярная сярод іх — гэта «Песня аб Мінску» на словы І. Панкевіча. Я параўноўваю яе з «Песняй аб Мінску» (словы К. Кірэенкі), якая ўвайшла ў папярэдні зборнік. У першай песні не было натхнёнасці, шчырага парывання пачуццяў, інтымнасці ў выяўленні гордай любві да роднага горада. Затое ўсё гэта характэрна для музыкі і тэксту новай песні аб нашай сталіцы. Невыпадкова пад музыку новай «Песні аб Мінску» маршыруюць калоны дэманстрантаў у час святочных урачыстасцей, яе ведаюць у самых далёкіх кутках рэспублікі.

У зборнік увайшлі ўжо вядомыя лірычныя песні: «Па-над лесам, па-над борам» (словы А. Русака), «Вечарам ясным» (словы К. Кірэенкі) і «Я люблю» (словы А. Русака). Апошнюю мы слухалі ў выкананні Вольгі — гераіні кінафільма «Вясновыя навальніцы». Наўрад ці варта было яе ўключаць у зборнік. Інтанацыйны лад, гарманічная мова песні паўтараюць ужо многа разоў чутае.

І яшчэ аб адной песні: гэта — «Добры дзень». Паэт А. Русак напісаў два варыянты тэксту: першы — «Для прывітання гасцей», другі — «Для выязных канцэртаў». І ў тым і ў другім песня ўспрымаецца як вясёлае, добразычлівае прывітанне добрым сябрам. Кампазітар максімальна наблізіўся тут да народна-песеннага меласу. Думаецца, што нашы канцэртныя брыгады з поспехам маглі б уключаць песню ў свае праграмы.

У новых песнях кампазітар звяртаецца зараз больш да тэм сённяшняга дня, яны напоўнены радасна-прыўзнятым настроем, адчуваннем нашай цудоўнай рэчаіснасці.

А. РАКАВА.

Новую канцэртную праграму рыхтуюць у гонар XXII з'езда партыі харавы і танцавальны калектывы Рэчыцкага раённага Дома культуры Гомельскай вобласці.

На здымку: удзельнікі хору выконваюць песню «Рэчыцкая лірычная».

Фота **Е. Ананкі.**

ІВАНАВА — КАСТРАМА

Рускі тэатр БССР імя М. Горкага закончыў свае гастролі ў Іванаве. Былі паказаны спектаклі «Аптымістычная трагедыя», «Барабаншчыца», «Дванаццатая гадзіна», «Мёртвая хватка» і інш.

Паралельна з паказам спектакляў у Іванаве калектыў выязджаў у раёны і вёскі вобласці: у Фурманава, Шую, Камсамольск, Палех, Юж і інш., дзе паказана больш 20 спектакляў.

Іванаўцы надзвычай цёпла сустрэлі ўсе нашы спектаклі. Не менш цёплыя сустрэчы былі і ў раёнах. На ранішнія спектаклі ў нядзельныя дні прыязджалі калгаснікі з бліжэйшых калгасаў. Калектыў правёў дзве вялікія творчыя сустрэчы з рабочымі слаўутых іванаўскіх тэкстыльных прадпрыемстваў. Мы пазнаёміліся са знатнымі ткачыхамі, з новай тэхнікай вытворчасці, выступілі з канцэртамі ў цэхах.

Такія сустрэчы надзвычай спрыяльна ўплываюць на творчыя справы калектыву, узбагачаюць яго новымі ўражаннямі, думкамі.

Наш калектыў у добрай творчай форме, нягледзячы на напружаную гастрольную загрузку. З натхненнем працуем над новымі спектаклямі: «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна (рэжысёр народны артыст РСФСР В. Рэдліх), над інсцэніроўкай рамана Ю. Германа «Адзін год» (рэжысёр заслужаны артыст БССР М. Співак). Калектыў спадзяецца выпусціць у Кастраме «Провады белых начэй» В. Панова.

Тэатр працуе таксама над спектаклем «Матухна Кураж і яе дзеці» Б. Брэхта.

Гастролі ў Кастраме калектыў пачынае сёння спектаклем «Аптымістычная трагедыя».

Вялікую ўвагу і штодзённую дапамогу аказваюць нам мясцовыя партыйныя, савецкія арганізацыі, абласное ўпраўленне культуры. Абласныя газеты шырока асвятляюць нашу працу, змяшчаючы рэцэнзіі на спектаклі, даючы высокую ацэнку як спектаклям, так і асобным выканаўцам.

А. АБУХОВІЧ,
народная артыстка БССР.

Справа гонару тэатра

Заканчваюцца гастролі ў Мінску Тэатра імя Я. Коласа. Беларускае тэатральнае таварыства ўзяло сабе за добры звычай падагульняць гастролі драматычных калектываў у Мінску абмеркаваннем паказаных спектакляў. Днямі тут быў наладжаны падрабязны разгляд спектакляў нашых віцебскіх гасцей, у якім прынялі ўдзел маскоўскія тэатральныя крытыкі Л. Жукава і Б. Емяльянаў.

Абое яны ў сваіх выступленнях сышліся на тым, што гастролі коласаўцаў прайшлі ў Мінску з поспехам, які абумоўлены ў першую чаргу ўдалым рэпертуарам. Сярод іншых тэатр прывёз два спектаклі, пастаўленыя па п'есах беларускіх драматургаў, — «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна і «Згублены сын» («Лявоніха») П. Данілава.

Але справа не толькі ў самім факце пастаноўкі гэтых п'ес, справа ў тым, што пастаўленыя спектаклі маюць прынцыповае значэнне для беларускага тэатральнага мастацтва.

У п'есе і спектаклі «Выгнанне блудніцы» (рэжысёр Б. Браганцаў), на думку крытыкаў, вырашаецца самая істотная тэма нашых дзён — фармаванне камуністычнай маралі ў людзей нашага часу. Драматург і тэатр дамагліся поспеху ў вырашэнні галоўнай задачы савецкай драматургіі. Цэнтральнымі вобразамі спектакля з'яўляюцца станоўчыя героі сучаснасці — паэт Гаворка ў таленавітым выкананні Ф. Шмакава і маладая калгасніца Галя (Я. Яленская). Праўда, Ф. Шмакаў крыху абытавіў вобраз Гаворкі, а рэжысёр і мастак не знайшлі яго вонкавага аблічча, апрануўшы Гаворку ў нецікавы, не тэатральны гарнітур. І тут крытыкі зрабілі вельмі слушную заўвагу аб тым, што савецкая п'еса, вобраз савецкага чалавека на сцэне мае права на яркую, цікавую тэатральнасць. Многія думаюць, што тэатральнасць уласціва толькі шэкспіраўскім спектаклям, а калі ставіцца савецкая п'еса, рэжысёры чамусьці менш за ўсё дбаюць аб прывабнай, захапляючай тэатральнасці, без якой наогул няма сцэнічнага мастацтва. Тым не менш вобраз Гаворкі цікавы тым, што ён жыве сапраўдным творчым жыццём, без надрыву, раздвоенасці і дэкларатыўнасці. Ён актыўны, наступальны па сваёй сутнасці, і гэта надае яго характару адметныя рысы сучасніка.

Менш задаволілі выступаўшых вобразы Леаніда Яснікава і Яўгеніі Любаміраўны. Калі Леанід чалавек таленавіты, наватар у біялагічнай навуцы, з шырокімі творчымі планамі і жыццёвымі інтарэсамі, то яго ўзаемаадносіны з Яўгеніяй Любаміраўнай павінны былі грунтавацца на нейкай іншай аснове, чым гэта паказана ў п'есе і спектаклі. У спектаклі ж Леанід — чалавек здробнены і мала цікавы, а любоў яго да Яўгеніі — простае захапленне прыгожай жанчынай.

З любоўю і майстэрствам зроблены ў спектаклі вобразы калгаснікаў — Галя (Я. Яленская), дзед (А. Ільінскі), маці (А. Лагоўская) і інш. Яны надаюць спектаклю светлы, аптымістычны тон, прыўзнятасць і адчуванне радасці калгаснага жыцця.

«Выгнанне блудніцы» — адзін з лепшых спектакляў гастрольнай праграмы коласаўцаў.

Не менш цікавую размову выклікаў і спектакль «Згублены сын» (рэжысёр Ю. Шчарбакоў). Л. Жукава і Б. Емяльянаў таксама далі яму ў сваіх выступленнях станоўчую ацэнку як прынцыповай з'яве беларускага тэатральнага мастацтва. Адзначана многапланавасць, якая не пашкодзіла драматургіі п'есы, а наадварот — стварыла больш поўную карціну жыцця беларускага сялянства пасля прыгону. У п'есе ёсць цікавыя характары (лясніцы, Лявоніха, Юрка, Марыся, яе бацька, паніч, ураднік, войт, дзевер і інш.), вельмі добра пастаўлены народныя сцэны, арганічна ўліваецца ў дзеянне музыка, песні, танцы.

Спектакль адметны вялікай колькасцю акцёрскіх удач.

Разам з тым Б. Емяльянаў зазначыў, што сама п'еса не пазбаўлена істотных недахопаў. Ёй, напрыклад, нестае гістарызму. Сяляне, паказаныя ў п'есе, не зусім адпавядаюць эпосе сямідзесятых гадоў XIX стагоддзя.

Дакладчыкі прааналізавалі яшчэ два спектаклі, паказаныя тэатрам у Мінску. Гэта «Заводскія хлопцы» (рэжысёр Ю. Собалеў) і «Сяржант міліцыі» (рэжысёр Б. Браганцаў).

Адзначыўшы, што тэатр актыўна працуе над сучасным рэпертуарам, дакладчыкі выказалі слушную думку: не кожная п'еса аб сучаснасці — сапраўды сучасная. У некаторай меры гэта мае дачыненне і да адзначаных спектакляў. Праўда, абодва яны пастаўлены прафесіянальна дакладна, размеркаванне акцёраў па ролях правільнае, глядзяцца яны з цікавасцю. Але п'есы самі па сабе ілюстрацыйныя, не глыбокія па свайму зместу. Моладзь у іх паказана павярхоўна, у традыцыі так званых «маладзёжных» п'ес, дзе зубаскальства часам выдаецца за аптымізм, а пустая лёгкадумнасць — за жыццярадаснасць.

Тэатр прыклаў шмат намаганняў, каб напоўніць спектаклі жыццём, і яму гэта ў асноўным удалося. Ёсць асобныя цікавыя вобразы, адчуваецца атмасфера дружнага камсамольскага калектыву, заклапочанага лёсам сваіх таварышаў. Але гэта мала для глыбокага паказу сённяшняй моладзі.

У абмеркаванні прынялі ўдзел Я. Рамановіч, П. Левашоў, галоўны рэжысёр Тэатра імя Я. Коласа Ю. Шчарбакоў, дырэктар тэатра І. Дорскі, якія дапоўнілі дакладчыкаў сваімі заўвагамі па спектаклях і працы тэатра ў цэлым.

Я. Рамановіч адзначыў прыкметныя поспехі беларускага тэатра напярэдадні XXII з'езда партыі. Гэтыя поспехі ёсць і ў калектыве коласаўцаў. І тут вельмі важна, каб тэатр не заспакоіўся на дасягнутым, а змагаўся за высокія ўзоры мастацтва, быў наватарам у пастаноўцы жыццёва важных праблем, у стварэнні яркіх сцэнічных характараў савецкіх людзей.

Гэтую думку падтрымаў і П. Левашоў, дадаўшы, што многія тэатры яшчэ не глыбока вырашаюць праблемы сучаснасці ў сваіх спектаклях. І спектакль «Выгнанне блудніцы», на думку П. Левашова, атрымаўся аднапланавым, а ў некаторых месцах недакладна акцэнтаваным.

І. Дорскі і Ю. Шчарбакоў гаварылі аб творчых шляхах коласаўскага тэатра. Асноўная яго лінія — гэта стварэнне народных характараў і вобразаў, лінія, якая пачалася яшчэ з пастаноўкі п'ес «У пушчах Палесся», «Вайна—вайне», «Несцерка», «Чалавек з ружжом» і працягваецца зараз у спектаклі «Навальніца будзе» і іншых праграмных спектаклях.

З прамовай на абмеркаванні выступіў міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў.

— Гастролі тэатра, — сказаў т. Кісялёў, — у гэтым годзе прайшлі здавальняюча. І можна гаварыць аб іх станоўчых выніках. За мінулы сезон тэатр зрабіў пэўны ўклад у развіццё мастацтва рэспублікі. Выраслі кадры акцёраў, калектыў стаў больш цікавым, і на гастролях паказаны рад добрых спектакляў.

Тав. Кісялёў вылучае сярод іх «Выгнанне блудніцы» і «Згублены сын», як найбольш удалыя і цікавыя, раіць тэатру і надалей галоўную ўвагу звяртаць на работу з беларускімі аўтарамі, паставіўшы перад сабой задачу стварыць у першую чаргу спектаклі аб сучаснасці.

* * *

Беларускае тэатральнае таварыства і надалей, відаць, будзе практыкаваць такія абмеркаванні. Яны, безумоўна, карысныя, але абмеркаванні прынеслі б яшчэ большую карысць, калі б не былі такімі келейнымі. Таварыства мае шырокія магчымасці арганізаваць гэтую справу больш змястоўна і цікава. Вядома, што на спектаклі коласаўцаў у Мінску прыязджалі калгаснікі, прыходзілі цэлыя рабочыя калектывы. Чаму б той жа самы спектакль «Выгнанне блудніцы», напрыклад, не абмеркаваць з гледачамі якога-небудзь бліжэйшага калгаса, а «Заводскіх хлопцаў» — на заводзе?

Неабходна таксама запрашаць на абмеркаванні больш пісьменнікаў, крытыкаў, прадстаўнікоў грамадскасці.

ШЛЯХ МАЙСТРА

Нашы кінагледачы яшчэ мала ведаюць аб дзеячах беларускага кінамастацтва і наогул аб яго развіцці, бо ў рэспубліцы пакуль што няма больш-менш значных прац, якія знаёмілі б іх з гісторыяй і тэорыяй беларускага кіно, з яго майстрамі.

Вось чаму пэўную цікавасць мае брашура Е. Л. Бондаравай «Ул. Ул. Корш-Саблін», выдадзеная Таварыствам па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Беларускай ССР. Брашура не прэтэндуе на навуковае, манаграфічнае даследаванне. Яна напісана ў форме нарыса-партрэта. Аўтар паказвае творчы шлях кінарэжысёра, дае ацэнку важнейшым яго фільмам, гаворыць аб тых цяжкасцях, якія даводзілася пераадольваць маладой беларускай кінематаграфіі.

У брашуры многа фактычнага матэрыялу. Аднак, дзякуючы ўдалай кампазіцыі, нарыс-партрэт не здаецца перагружаным фактамі.

Нарыс складаецца з дзевяці невялічкіх частак. Кожная частка ахоплівае пэўны этап творчай дзейнасці Ул. Корш-Сабліна, а загалоўкі вызначаюць галоўны кірунак гэтых этапаў.

У першай частцы «Здзяйсняюцца мэты» гаворыцца аб тым, якім шляхам Ул. Корш-Саблін трапіў у кінамастацтва. Дваццацітрохгадовым юнаком прыйшоў ён у кіно. Многа давялося працаваць пад кіраўніцтвам вядомых у той час дзеячоў савецкага кіно, пакуль адчуў сябе здольным да самастойнай творчай работы. Толькі ў 1928 годзе Ул. Корш-Саблін прыступіў да пастаноўкі свайго першага фільма на Беларускай кінастудыі, якая базіравалася тады ў Ленінградзе. З гэтага часу ён назаўсёды звязаў сябе з беларускім кінамастацтвам.

Першы беларускі фільм «У агні народжаная» расказаў аб вялікіх перамогах беларускага народа ў сацыялістычным будаўніцтве. Ён з'явіўся значнай удачай маладога рэжысёра беларускага кіно.

Ул. Корш-Саблін адзін з першых у савецкім кіно ўзяўся за вырашэнне тэмы калектывізацыі і стварыў фільм «Сонечны паход». Аўтар брашуры дае ацэнку фільму з пазіцый сучасніка, прыводзіць водгукі тагачаснай крытыкі.

Е. Бондарава ў брашуры прасочвае паступовы рост майстэрства рэжысёра. Амаль штогод Ул. Корш-Саблін стварае новы мастацкі фільм. Адзін за другім выйшлі такія фільмы, як «Стальны шлях», «Залатыя агні», «Першы ўзвод», «Шукальнікі шчасця», «Маё каханне» і іншыя. Большасць з іх маладое пакаленне не бачыла. Таму зусім правільна, што аўтар брашуры дае кароткую, але змястоўную характарыстыку кожнаму фільму, гаворыць пра тыя задачы і праблемы, якія ўздымаліся і вырашаліся маладой беларускай кінематаграфіяй.

Значнае месца ў брашуры адводзіцца творчай рабоце Ул. Корш-Сабліна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вайна застала яго ў Ленінградзе, куды ён выязджаў па справах Беларускай кінастудыі. Рэжысёр-пастаноўшчык стаў камандзірам добраахвотнага знішчальнага ўзвода. Ён узнагароджан медалем «За абарону Ленінграда»

У гэтым жа раздзеле, названым «У баявым страі», гаворыцца пра клопаты партыі і ўрада ў тыя цяжкія гады вайны аб нацыянальнай культуры беларускага народа. У 1943 годзе ў Маскве была створана беларуская кінагрупа, якую ўзначальвалі Ул. Корш-Саблін і М. Садковіч. Гэтая група выпусціла некалькі дакументальных фільмаў аб Беларусі.

Наступным вялікім этапам у творчай рабоце Ул. Корш-Сабліна, а таксама ўсёй беларускай кінематаграфіі з'яўляецца пасляваенны перыяд. Работу рэжысёра ў гэты час аўтар умоўна падзяляе на некалькі момантаў: аднаўленне беларускай кінематаграфіі; паказ ваеннай тэматыкі; паказ жыцця калгаснай вёскі; экранізацыя лепшых твораў беларускіх тэатраў і г. д.

Як і ў дні маладосці, рэжысёр і зараз творча актыўны, у яго багата планаў, задум, імкненняў.

Брашура з'яўляецца карысным пачынаннем у стварэнні асобных прац аб дзеячах беларускага кінамастацтва.

Э. КАНДЗЕРСКІ,
студэнт аддзялення журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна.

ТРЫ БІТВЫ З МЯШЧАНСТВАМ

Творчая трыбуна

I.

Мае аднагодкі, якім пайшло на шосты дзесятак, добра памятаюць, з якой насцярожанасцю ставіўся некалі юнак у юнгштурмаўцы да маладога чалавека ў капелюшы і пры гальштуку. Мы, камсамольцы дваццатых гадоў, наіўна думалі, што разам з гальштукам, капелюшом, разам з кракавякамі і вальсамі ў наша асяроддзе, чаго добрага, можа прасачыцца мяшчанская ідэалогія.

Значна пазней мы зразумелі, што не па адзенню распазнаецца агідная сутнасць мяшчанства. Жыццёвы і палітычны вопыт вучыў, што юнгштурмаўка не можа ўратаваць ад чужой ідэалогіі, асабліва тады, калі ў чалавека няма дастатковага ідэйнага гарту.

Мяшчанства ў розны час набывала рознае аблічча. Вымушанае прыстасоўвацца да новых умоў, яно ўдасканальвала сваю заўсёдную здольнасць да мімікрыі. Але нішто ў канчатковым выніку не дапамагае яму, бо савецкія людзі ўмеюць зрываць маскі з паборнікаў уласніцтва, індывідуалізму і іншых носьбітаў старой, варожай нашаму грамадству маралі. І ўсё ж рэцыдывы мяшчанства і дагэтуль замінаюць нам у барацьбе за чалавека высокай камуністычнай свядомасці.

Літаратура наша, дапамагаючы партыі ў камуністычным выхаванні савецкіх людзей, у апошні час усё больш узмацняе свае ўдары па разнастайных перажытках мінуўшчыны, у тым ліку і па мяшчанству. Шкада толькі, што даволі часта найбольшая ўвага аддаецца знешнім прыкметам мяшчанства, якія кожнаму відны і няўзброеным вокам. З плана агульнаграмадскага барацьба нярэдка пераносіцца толькі ў сферу прыватных густаў, звычак, нібы справа ідзе не пра розныя адносіны да жыцця, а пра моды, фасоны, абедзенныя меню. Калі ўжо сапраўды біць па мешчаніну, то варта раскрываць самыя цёмныя закуткі яго свядомасці, дабірацца да вытокаў уласніцтва, хціўсці, эгаістычнай пагарды да інтарэсаў калектыву, развенчваць да канца асцярожненькіх абывацеляў, што кіруюцца няхітрым правілам: «Мая хата з краю». Вось чаму, прачытаўшы раман Уладзіміра Карпава «Вясеннія ліўні», у якім даволі многа ўвагі аддаецца выкрыццю мяшчанства, хочацца высветліць, ці можна згадзіцца з усімі пісьменніцкімі ацэнкамі, сімпатыямі, антыпатыямі.

Многа ў рамане слушнага, разумнага, упершыню заўважанага. Пісьменнік сапраўды нанёс даволі адчувальны ўдар па мяшчанству, хціўсці, уласніцтву. У рамане паказана сям'я Сасноўскіх, дзе мяшчанскую пошласць не так лёгка заўважыць.

Гаспадыня дома Вера Антонаўна здольна прывабіць і не такіх людзей, як другі яе муж Максім Сасноўскі, які захапляўся яе прыгажосцю і дамавітасцю, зусім не думаючы аб душы гэтай жанчыны. Аб душы і сама Вера Антонаўна мала клапацілася, і яна зарасла мяшчанскім пустазеллем, якое заглушыла і без таго рэдзенькія ўсходы чалавечнасці. Галоўнае для гэтай жанчыны — не састарэць раней часу, застацца прывабнай для мужа і не толькі для яго... Недарма, гледзячы на жонку, Максім Сцяпанавіч, як сцвярджае аўтар, пераконваўся ў тым, што Вера Антонаўна пры жаданні «насуперак усяму магла б прымусіць сябе быць здаровай, прыгожай, магла зрабіць такімі і другіх». «З нястомнай настойлівасцю... яна, скажам, тысячу разоў магла паўтараць, каб дочкі не сутуліліся, не моршчылі лобіка — паўтарала, пакуль не дамаглася свайго». У дзяцей няма ніякіх здольнасцей да музыкі, але іх муштруюць, прымушаюць спяваць, блямболіць на раялі. А як жа: гэтага патрабуе «мяшчанская свецкасць». І галоўнае — не адставаць ад моды, не даць нікому апярэдзіць сябе. Пайшла мода на індывідуальныя дачы — няхай і ў Сасноўскіх на зайздрасць іншым будзе свой асабняк за горадам. Нехта набыў каштоўныя ўнікальныя рэчы — і неўзабаве ў Веры Антонаўны з'явіцца нешта яшчэ больш арыгінальнае.

Перад намі прыгожая балотная кветка, якая паступова гніе сама і атручвае ўсё вакол сябе. Сына, маладога чалавека з добрымі задаткамі, яна дзень за днём прывучае да думкі, што перад ім павінны расступацца ўсе людзі, а калі яны гэтага не робяць, то штурхай іх рукамі і нагамі, любой цаной дамагайся свайго. Карыстаючыся бязвольнасцю мужа, яна прымушае яго, таленавітага інжынера, насуперак свайму партыйнаму сумленню падтрымліваць кансерватараў, не спрачацца з аматарамі штурмаўшчыны, жыць у згодзе з паклёпнікамі. Максім Сцяпанавіч і сам не заўважыў, калі і як трапіў ён у мяшчанскае балота. Непрыкметна ўздзеўшы на сябе ярмо ўласніцтва, чалавек гэты, на сваю бяду, і не рваўся з палону.

Быт сваёй сям'і здаваўся Максіму Сцяпанавічу ўстойлівым і нармальным. А ўстойлівасці не магло быць, бо падрасталі дзеці, якіх у школе, піянерскіх атрадах, у камсамоле вучылі інакш разумець жыццё, ставіцца з пашанай да калектыву. Вера Антонаўна лічыла, што ўсе людзі павінны патураць яе сыну, а калі яны гэтага не робяць — тым горш для іх. Няхай пакутуе пакрыўджаная дзяўчына, няхай за парогам інстытута застанецца нехта іншы, мабыць, у сто разоў больш здольны за нашчадка Веры Антонаўны, яна, маці, любой цаной праб'е дарогу для свайго сына, знойдзе апраўданне, калі юнак парушае нормы савецкай маралі. Школа, інстытут, камсамол падтрымліваюць усё тое добрае, што яшчэ захавалася ў душы юнака, а маці сваім уплывам толькі нявечыць жывую душу сына, збівае яго з тропу. Вось вам і канфлікт, у вырашэнні якога не можа быць кампрамісаў. У рамане іх і няма. Няважна, што часамі бярэ верх звышклапатлівая маці, што сваім нейтралітэтам Максім Сцяпанавіч спрыяе яшчэ большаму «амяшчаньванню» сям'і — усё гэта да пары да часу. Недарма юнак найлепш адчувае сябе не дома, не пад крылцам квактухі-маці, а на цаліне, куды ён з вялікай радасцю едзе разам з іншымі студэнтамі, на вытворчай практыцы, дзе ўпершыню пазнае асалоду самастойнай творчай працы. Быт у сям'і Сасноўскіх і не такі ўжо ўстойлівы, як здавалася Максіму Сцяпанавічу.

Праўда, я не ўпэўнены, што гэты канфлікт у рамане вырашаны найлепшым чынам. Вера Антонаўна ні адной пядзі ў сваёй пазіцыі не ўступіла, нават на парозе смерці яна была ўпэўнена, што жыла правільна. Невядома, што было б з Максімам Сцяпанавічам, з Юркам, з дочкамі Сасноўскіх, каб не смерць Веры Антонаўны. Гераіня, мабыць, ! памерла толькі дзеля таго, каб аўтару лягчэй было вызваліць многіх людзей ад яе шкоднай апекі і развязаць усе сюжэтныя вузельчыкі, што былі завязаны менавіта ёю. Так, вядома, лягчэй, бо не трэба выносіць канфлікт за парог інжынеравай дачы. Што ж, уваскрашаць Веру Антонаўну не варта, калі аўтар палічыў, што ёй лепш за ўсё памерці. Няхай будзе так, тым больш, што трэба ж неяк Максіму Сцяпанавічу зноў стаць нармальным чалавекам. А ён, хоць і гаруе, плача скупымі мужчынскімі слязамі, але неўзабаве пачынае разумець, што «успаміны аб Веры Антонаўне грузам вісяць на ім і некуды цягнуць... Выходзіла так, што ўладу яе ён адчуваў і пасля смерці. Вера Антонаўна жыла ў ім, як і ў дочках. А галоўнае — гэтая ўлада перашкаджала, і пакуль ён не вырвецца з-пад яе — будзе аставацца ў мінулым, з якім не заўсёды згаджалася сумленне».

Хоць і з вялікім спазненнем, а Максім Сцяпанавіч нарэшце зразумеў сапраўдную чалавечую сутнасць сваёй жонкі і ўсяго, што было з ёю звязана. Тады прыйшла і агіда да мяшчанства, уласніцтва, да ўсяго свайго быту. Цяпер ужо непатрэбны сталі чалавеку церам-церамок у дачнай мясцовасці, шматлікія атрыбуты і аздобы камерна-канарэечнага раю.

Цяпер пагаворым аб некаторых сур'ёзных упушчэннях аўтара. Калі аўтар пісаў пра сям'ю Сасноўскіх, ён імкнуўся паказаць, што мяшчанства нявечыць самую душу чалавека, што яно шкодна ва ўсіх сваіх праявах. У некаторых жа іншых калізіях аўтар цікавіўся больш знешнімі прыкметамі, чым глыбіннымі працэсамі, што адбываюцца ў свядомасці людзей. Намінальна ўсё распісана правільна. Указана месца дзеяння: горад Мінск. Падзеі прывязаны да пэўнага часу, храналагічныя межы якога дакладна вызначаны: запуск першых штучных спадарожнікаў зямлі — выпуск статысячнага самазвала Мінскім аўтазаводам. Што можа быць больш сучаснага, чым такі жыццёвы матэрыял, пачэрпнуты з сённяшняй практыкі савецкіх людзей.

А вось вазьміце такога героя, як механік Аляксееў, і вы, напэўна, заўважыце, што сучаснага ў гэтым вобразе вельмі мала. Аўтар нам гаворыць, што Аляксееў — сціплы і разумны чалавек, выдатны працаўнік, рацыяналізатар, але, бачыце, ёсць акалічнасці, якія незалежна ад асабістай волі механіка не даюць яму магчымасці жыць, як усе людзі. Што гэта за акалічнасці? Аказваецца, у пачатку вайны Аляксееў толькі-толькі пачаў уключацца ў падпольную антыфашысцкую барацьбу, быў схоплены гестапаўцамі і вывезены ў Германію. Там ён таксама не скарыўся ворагу, але... чалавеку здаецца, нібыта цяпер ніхто не паверыць, што ён і ў канцэнтрацыйным лагеры паводзіў сябе добра і не стаў здраднікам. Чалавека апаноўваюць такія ж самыя жахі, якія не давалі спаць герою камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім» вучонаму Тулягу. На заводзе ў асобе начальніка цэха Кашына знаходзіцца і свой Гарлахвацкі, які таксама шантажыруе Аляксеева, даводзіць яму, што такому чалавеку трэба быць ніжэй травы, цішэй вады, бо ніхто і ніколі не паверыць у яго шчырасць і сумленнасць. Мы не сцвярджаем, што цяпер няма палахліўцаў-абывацеляў, няма шантажыстаў. Але ж пасля ліквідацыі шкодных вынікаў культу асобы, пасля найвялікшай барацьбы, якую партыя правяла з усімі відамі перастрахоўкі, Аляксееў мог адчуваць сябе зусім інакш, прынамсі, не паўтараць шлях Тулягі.

Памылка аўтара не ў тым, што ён быццам бы прыдумаў такі чалавечы характар. Уся справа ў тых абставінах, у якія пастаўлены Аляксееў. Колькі б пісьменнік ні падкрэсліваў, што такім палахліўцам Аляксеева зрабілі абставіны, гэтаму цяжка паверыць. Пісьменніку здаецца, што механік — станоўчы герой, шчыры чалавек. А на самай справе перад намі абывацель, які баіцца ўласнага ценю. Нават не верыцца, што такі чалавек некалі меў дачыненне да антыфашысцкага падполля, што гэта быў нязломны змагар. Куды ж, у такім разе, падзелася нязломнасць Аляксеева, чаму выбрана такая неапраўданая нічым логіка развіцця гэтага вобраза? Навошта пісьменнік ператварыў героя ў мешчаніна, абывацеля і потым апраўдвае такое перараджэнне спасылкамі на нейкія неспрыяльныя акалічнасці? Абывацель застаецца абывацелем, як ты яго ні рэабілітуй.

Паспрабуем цяпер высветліць, ці ўсё лагічна і ў трактоўцы вобраза начальніка цэха Кашына. Мы ўжо гаварылі, што гэта шантажыст, правакатар, які гатовы паклёпнічаць на сумленных людзей, аплёўваць іх лепшыя пачуцці. А ў імя чаго? Аўтар адказвае на гэтае пытанне: у імя свайго ўласнага мяшчанскага дабрабыту. Дзеля гэтага ён адстойвае штурмаўшчыну, заахвочвае рвацкія настроі адсталых рабочых, не дае разгарнення рацыяналізатарам і вынаходнікам. Яму здаецца, што без штурмаўшчыны, аўралаў, падхалімства перад дырэктарам і грубай лаянкі з рабочымі парушыцца заведзены на заводзе парадак, і ён, Кашын, стане тут лішнім чалавекам. А калі гэта так, то трэба ўсімі сіламі абараняць свае пазіцыі, свой дабрабыт. Адным словам, Кашын — мешчанін, які ў мэтах маскіроўкі робіць выгляд, што ён думае і дбае толькі аб інтарэсах прадпрыемства. Тут аўтар ні ў чым не паграшыў супраць жыццёвай праўды.

Выклікаюць пярэчанні адносіны калектыву да Кашына. Увесь калектыў завода — за рытмічную і зладжаную працу, начальнік цэха Кашын, абараняючы свой мяшчанскі дабрабыт і спакой, — за штурмаўшчыну. Што ж, ёсць і цяпер на паасобных прадпрыемствах штурмаўшчына, і з гэтым вядзецца рашучае змаганне. Але як жа расстаўлены сілы ў рамане? Усе разумеюць, што Кашын стаў перашкодай для цэха, што ён разбэшчвае маральна няўстойлівых людзей, заахвочвае адсталыя настроі, зрывае падрыхтоўку да пераходу на сямігадзінны рабочы дзень. Пра гэта адкрыта гавораць рабочыя, ідуць спрэчкі ў парткоме, прафсаюзнай арганізацыі ды ўсё застаецца па-ранейшаму. Які ж гэта канфлікт, калі Кашын робіць усё, што хоча, амаль не сустракаючы процідзеяння, і толькі няшчасце ў цэху прымушае калектыў падняць адкрыты бунт? Адным словам, глыбокага ворыва не атрымалася. Вялікі рабочы калектыў доўгі час не мог справіцца з адным мешчанінам... Чалавек наносіць заводу вялікую шкоду, з ім цацкаюцца, прыгадваючы былыя яго партызанскія заслугі. Гэта прыніжае калектыў.

Раман «Вясеннія ліўні» — твор многапраблемны, густа на-

МАСТАК У КІНО

Павышэнне выяўленчай культуры нашых фільмаў — задача вельмі важная і адказная для далейшага росту кінамастацтва рэспублікі. На жаль, гэтыя пытанні пакуль застаюцца па-за ўвагай нашай крытыкі і мастацтвазнаўства.

Значэнне працы мастака ў пастаноўцы фільма надзвычай вялікае. Удача таго ці іншага эпізода кінакарціны ў многім звязана з яго выяўленчай трактоўкай, а апошняя ў рашаючай ступені вызначаецца мастаком.

У Мінскім акруговым Доме афіцэраў адкрыта выстаўка работ беларускіх мастакоў кіно. Гэта — творчая справаздача мастакоў студыі «Беларусьфільм» за апошнія некалькі год іх работы.

На выстаўцы прадстаўлены работы трох мастакоў кінастудыі — Я. Ганкіна, Ю. Булычава, В. Белавусава. У экспанаваных эскізах да фільмаў «Міколка-паравоз», «Палеская легенда», «Чырвонае лісце», «Гадзіннік спыніўся апоўначы», «Нашы суседзі», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Строгая жанчына», «Чалавек не здаецца» і «Апавяданні пра юнацтва» іх аўтары намячаюць агульныя рысы выяўленчага вырашэння фільма, удакладняюць месцы натурных здымак, шукаюць цікавыя ракурсы, вызначаюць дэталі дэкарацый і г. д. Многія з гэтых эскізаў вызначаюцца глыбокім творчым вырашэннем, цікавымі пошукамі.

Прыцягваюць увагу вобразныя і эмацыянальныя эскізы Я. Ганкіна да фільма «Чалавек не здаецца». Ярка, таленавіта раскрыты, напрыклад, адзін з вузлавых эпізодаў карціны: адзінаборства савецкага воіна з нямецкім танкам. Вялізны танк чорным ценем насоўваецца на невялікую каржакаватую постаць салдата, які бясстрашна ідзе са звязкаю гранат *насустрач ворагу, каб перамагчы ці памерці*, — гэта моцна, выразна, уражліва. Тут дакладна выказана філасофія *кінакарціны аб* непахіснасці савецкага чалавека, аб сіле чалавечага духу.

Выразны другі эскіз, які адлюстроўвае той момант, калі немец-танкіст сочыць за адважным рускім воінам праз глядзельную шчыліну танка.

Такі ж творчы падыход характэрны для работ мастака да сцэны «Бежанцы». Асабліва выразна відаць уменне мастака бачыць падзеі «вачыма апарата». Адчуванне дынамікі кінематаграфічнага дзеяння ствараюць натоўпы людзей, якія пакручастай стужкай ідуць па дарозе; дым пажарышчаў на заднім плане, коміны згарэўшых дамоў і абвугленыя дрэвы ўздоўж дарогі.

Адначасова варта адзначыць, што сцэны фільма, для якіх выкананы гэтыя эскізы, не нясуць у сабе такога драматычнага напалу: з-за слабай рэжысёрскай работы яны вырашаны даволі павярхоўна. Даводзіцца толькі пашкадаваць, што цікавая задума мастака не была па-сапраўднаму рэалізавана ў кінатворы.

Прадметная канкрэтнасць, дакладнае ўзнаўленне з усімі падрабязнасцямі дэталей абстаноўкі адрозніваюць эскізы дэкарацый Я. Ганкіна да фільма «Гадзіннік спыніўся апоўначы».

Пошукі эмацыянальнага ключа да вобраза кінакарціны вызначаюць многія прадстаўленыя на выстаўцы работы Ю. Булычава. Эскізы мастака маюць у сабе побач з вонкавым вобразам будучага кадра яго ўнутраны эмацыянальны змест. Такія эскізы «Хутар» і «Заезны двор» да другой серыі «Першых выпрабаванняў», «Вакзал» і «Штаб немцаў» да фільма «Міколка-паравоз», «Мост» да карціны «Дзяўчынка шукае бацьку». Мастак умее раскрываць атмасферу дзеяння, настрой сцэны. Ён дае магчымасць адчуць мітусню і шумлівасць жыцця вакзала, разгубленасць нямецкіх акупантаў, вымушаных уцякаць з беларускай зямлі.

Вось як скупа, лаканічна і ў той жа час выразна вырашае, напрыклад, мастак сцэну ў нямецкім штабе. На раялі, што стаіць ля сцяны, складзены чамаданы. Зверху на чамаданах ляжыць каска. На пярэднім плане пусты, ужо ачышчаны ад папер стол. Пасярэдзіне пакоя — сілуэт нямецкага афіцэра. Паспешлівыя зборы скончаны — афіцэр перад адыходам задумаўся на момант, нібы спрабуючы, і, відаць, беспаспяхова, разабрацца ў тым, што адбываецца.

У наяўнасці —нешматслоўнасць вобразнай мовы, выразныя, ёмкія па сэнсаваму зместу дэталі, праўдзівая перадача настрою сцэны.

З работ В. Белавусава найбольш цікавыя эскізы да фільма «Чырвонае лісце». Дамагаючыся патрэбнай кампаноўкі прасторы, адпаведнага асвятлення, мастак дасягае эфекту ў выяўленчай трактоўцы турэмнай камеры, у якую кінуты герой кінакарціны Андрэй Мяцельскі. Нізкія скляпенні, халодная, масіўная цагляная сцяна, паўзмрок выклікаюць прыгнечанае пачуццё адзіноты і трывогі. Да ўдач В. Белавусава варта аднесці таксама эскіз сцэны «Пакаранне Андрэя». Паказаны зверху, з усіх бакоў акружаны дамамі з маленькімі акенцамі з кратамі, цвілы двор турмы, куды амаль не пранікае сонца, выглядае страшным, маўклівым каменным мяшком.

Паспяховыя пошукі мастаком сацыяльных дэталей абстаноўкі відаць у яго эскізах да карціны «Палеская легенда».

На жаль, далёка не ўсе эскізы мастакоў «Беларусьфільма» вырашаны з глыбокім пранікненнем у матэрыял. Нямала работ павяр*хоўных, халодных, раўнадушных. Адчуваецца яшчэ нясмеласць* у падыходзе да раскрыцця сэнсу той ці іншай сцэны. Часта мастакі не асмельваюцца пераступіць мяжу традыцыйных рашэнняў, адмовіцца ад збітага, ужо даўно знойдзенага. Памяшканне падпольнай рэдакцыі, якім паказвае яго Я. Ганкін у эскізе да фільма «Гадзіннік спыніўся апоўначы», гледачы бачылі неаднаразова ў гісторыка-рэвалюцыйных карцінах яшчэ з 20-х гадоў. Падвал з каменнымі скляпеннямі, з газавай лямпай на стале і кіпай неахайна кінутых газет — гэта ўжо штамп у кіно. Самае прыблізнае, павярхоўнае вырашэнне адчуваецца ў эскізах В. Белавусава да кінафільма «Строгая жанчына».

Мала яшчэ ў работах нашых кі*намастакоў выразных, яркіх дэталей.* А ўдала знойдзеная дэталь быту, касцюма гаворыць іншы раз больш, чым доўгія сцэны размоў і тлумачэнняў герояў. Выяўленчая якасць фільмаў студыі будзе тым вышэйшай, чым больш будзе пошукаў, чым больш будзе смеласці і творчага гарэння ў працы мастакоў.

А. КРАСІНСКІ.

З ДАПАМОГАЙ САВЕТА КЛУБА

Доўгі час не ладзіліся справы з арганізацыяй культурнага адпачынку рабочых у Стаўбунскім сельскім клубе Веткаўскага раёна. Галоўнымі мерапрыемствамі, якія праводзіліся ў ім, былі танцы ды кінафільмы

— Хіба гэта адпачынак! — сказаў неяк на камсамольскім сходзе рабочы саўгаса «Стаўбунскі» С. Гулевіч. — Трэба савет арганізаваць і планаваць работу *клуба так, каб задавальняліся за*патрабаванні кожнага.

Тады і быў створан савет клуба. У склад яго ўвайшло 9 чалавек. Сярод іх — настаўнік мясцовай сярэдняй школы А. Савасценка, сакратар камітэта камсамола Я. Грышачкін, рабочая саўгаса А. Зямцова і інш. Старшынёй савета выбралі загадчыка сельскага клуба Галькіна.

На першым жа пасяджэнні савет зацвердзіў план работы. Было прадугледжана правядзенне самых разнастайных мерапрыемстваў. Так, напрыклад, было вырашана арганізаваць выстаўку работ сельскіх фотааматараў. За кароткі тэрмін на выстаўку паступіла 57 здымкаў, разнастайных па тэматыцы. Тут і краявіды навакольнай прыроды, і партрэты лепшых працаўнікоў саўгаса, і вытворчыя здымкі.

*Па рашэнню савета клуба ў вёс*цы арганізаваны агіткалектыў. Некалькі разоў выступалі аматары самадзейнасці на сцэне сельскага клуба.

Цяпер у клубе чытаюцца лекцыі на самыя разнастайныя тэмы, праводзяцца літаратурна-мастац*кія вечары. З кожным днём расце* колькасць актывістаў клубнай работы.

М. ЕРМАКОЎ.

У МУЗЕІ ПЕСНЯРА

Заўтра спаўняецца 79 год з дня нараджэння вялікага песняра Савецкай Беларусі Янкі Купалы.

У гэтыя дні асабліва мнагалюдна ў літаратурным музеі народнага паэта. З усіх куткоў рэспублікі, многіх гарадоў Савецкага Саюза, братніх краін народнай дэмакратыі прыязджаюць сюды працоўныя людзі, каб ушанаваць памяць таго, хто натхнёна ўславіў у сваіх неўміручых творах беларускі народ, савецкую Айчыну.

«Чалом табе, родны Янка Купала ад землякоў вялікага Тараса»,—пішуць у кнізе водгукаў украінскія пісьменнікі М. Нагнібяда, О. Ільчанка, Т. Масэнка, Б. Сцепанюк.

За апошні час Музей Янкі Купалы наведала звыш ста экскурсій, усяго каля 30 тысяч чалавек.

Навуковыя супрацоўнікі музея наладзілі сустрэчу ў Беларуцкай школе Лагойскага раёна, дзе ў свой час вучыўся Янка Купала. З успамінамі аб дзіцячых гадах паэта выступіла яго сястра Леакадзія Дамінікаўна Раманоўская. У сустрэчы прынялі ўдзел вучоны сакратар музея А. Есакоў, паэт Р. Няхай загадчык фондаў музея Я. Раманоўская.

У Слонімскім музеі і Музеі К. Заслонава адкрыты куткі «Янка Купала ў Слоніме», «Янка Купала на Аршаншчыне».

У лекторыі Літаратурнага музея Янкі Купалы з успамінамі і творамі, прысвечанымі настаўніку і сябру, выступілі беларускія пісьменнікі.

У сувязі з купалаўскімі днямі супрацоўнікі музея праводзяць гутаркі на мінскіх прадпрыемствах. У парку імя Горкага арганізавана фотавыстаўка для дзяцей гарадскіх піянерскіх лагераў. Звыш 20 школам рэспублікі і Украіны пасланы тэматычныя фотавыстаўкі, кнігі і альбомы, прысвечаныя жыццю і творчасці народнага паэта Беларусі.

Слова народнае, трапнае, звонкае

Слова народнае... Празрыстае і чыстае, як крынічная вада, трапяткое, трапнае, непаўторнае. Усімі колерамі вясёлкі ззяе яно ў песні, у частушцы, прыказцы і загадцы. Яно нараджаецца кожны дзень, і часта можна толькі дзівіцца, з якой аператыўнасцю адгукаецца народ на самыя разнастайныя падзеі нашага жыцця.

Ніжэй мы змяшчаем фальклорныя матэрыялы, запісаныя ў рэспубліцы ў апошні час настаўніцай сярэдняй школы № 23 г. Мінска Н. Царанковай і настаўнікам Кармянскай сярэдняй школы Добрушскага раёна М. Парукавым.

ЧАСТУШКІ АБ АСВАЕННІ КОСМАСУ

У савецкае навукі
Поспехі магутныя —
Ззаду нас даўно пляцецца
Амерыка смутная.

Наша тэхніка мацнее
З дня на дзень і з году ў год.
Сёння ў космас чалавека
Пасылае наш народ.

У неба зорачка ўзнялася,
Доўга я услед глядзеў.
Наш Гагарын Юрый ў космас
На ракеце паляцеў.

Ой, ракета ты ракета,
Ты — сястра мне родная.
Юрыю Гагарыну —
Слава ўсенародная.

Мілы грае на гармоні,
Я лявоніху скачу.
Можа, заўтра у ракеце
Разам з Юрам палячу.

Усё б я пела, усё б я пела,
Усё б я весялілася,
Каб ў ракеце разам з Юрам
У космас пусцілася.

Камуністаў нашых слава
Па планеце ўсёй ляціць.
Скажа партыя — Гагарын
На Венеру паляціць.

Ой, дзяўчаты, ой, дзяўчаты,
Што ў вас за натура!
Шкадуеце, што жанаты
Наш Гагарын Юра.

КАЛГАСНЫЯ ЧАСТУШКІ

Грай, гармонік, галасіста,
Мы частушкі прапяём,
Хай жа чуюць усе чыста,
Як мы весела жывём!

Запявай, сяброўка, песню!
Весялей, гармонік, грай!
Кукуруза на палетках
Узнялася, нібы гай.

Я ўсё пела галасіста,
Я ўсё весялілася:
Пакахала трактарыста —
І не памылілася.

Буйна ніва каласіцца —
Канца-краю не відаць.
Будуць засекі ламіцца —
Хлеба ж некуды дзяваць!

Шуміць ніва залатая...
Эх, якая шырыня!
Я дзяўчына баявая —
Камбайнеркай буду я!

А ЦЯПЕР — НА ВЯЛІКУЮ СЦЭНУ

Спектакль быў незвычайны. Шчырае хваляванне наглядалася ў зале і за кулісамі. Займае свае месцы аўтарытэтная камісія: народны артыст СССР Ул. Уладамірскі, народныя артысты БССР Д. Арлоў, К. Саннікаў і іншыя. А далей—выкладчыкі, артысты беларускіх тэатраў, прадстаўнікі грамадскіх устаноў, госці, сябры, бацькі і знаёмыя тых маладых юнакоў і дзяўчат, якія сёння трымаюць экзамен на ганаровае званне савецкага акцёра.

На здымку: сцэна са спектакля «Дзеці сонца». **У ролях:** Трошына — студэнт Л. Крук, Фімы — студэнтка М. Ганчарова.

Маладыя акцёры знешне спакойныя, але па тварах выканаўцаў можна заўважыць, што кожны з іх стрымлівае вялікае ўнутранае хваляванне. Усе маўклівыя, сканцэнтраваныя, паглыбленыя ў свае ролі. Адны накладваюць апошнія мазкі грыму, другія, адыйшоўшыся ў ціхі куток, паўтараюць найбольш цяжкае месца тэксту, праглядаюць заўвагі педагога. А на сцэне дэкарацыі, рэквізіт і ўсё тое, што будзе спрыяць раскрыццю іх маладых талентаў.

Заглядвае яшчэ раз да сваіх выхаванцаў кіраўнік курса, прафесар Д. Арлоў, падбадзёрвае і заспакойвае іх. Маўкліва акружаюць студэнты свайго педагога, у якога для кожнага знаходзіцца цёплае слова.

Успыхваюць пражэктары, сціхае шум, а звонкі голас абвяшчае:

— Пачынаем паказ дыпломных спектакляў дванаццатага выпуску акцёрскага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута... Максім Горкі... «Дзеці сонца»!.. Ролі выконваюць...

І пакуль гледачоў знаёмяць з выканаўцамі, перад вачыма педагога Д. Арлова і іншых выкладчыкаў праходзіць галерэя добра знаёмых маладых юнакоў і дзяўчат. Чатыры гады назад іх больш сотні, маючы прагу да тэатральнага мастацтва, даверылі педагогам сваю будучыню. Многа моладзі прыходзіла да рэжысёра Д. Арлова. Але спрактыкаванае вока педагога заўсёды магло адрозніць у маладых людзях сапраўдную любоў да мастацтва ад часовага і лёгкадумнага захаплення сцэнай.

Уступны экзамен быў цяжкі. Студэнтамі Тэатральнага інстытута сталі ўсяго два дзесяткі. Але педагог мог спадзявацца, што вырастуць з іх сапраўдныя акцёры.

З першых дзён вучобы выкладчыкі выхоўваюць у студэнтаў гарачую любоў да абранай прафесіі, раскрываюць усю складанасць працэсу стварэння вобраза і спектакля. Вучаць моладзь самаадданa служыць мастацтву, высока несці гонар савецкага акцёра, які ва ўсіх выпадках павінен быць перадавым грамадзянінам сваёй краіны. Яны заклікаюць студэнтаў не замыкацца ў вузкім коле прафесіянальных інтарэсаў, а на кожным кроку пашыраць свой светапогляд, глыбока вывучаць марксісцка-ленінскую філасофію, ведаць літаратуру, кіно, жывапіс, скульптуру, опернае мастацтва і г. д.

Чатыры гады навучання для студэнтаў былі тымі прыступкамі, якія вялі да спектакля. Работа пачыналася з прасцейшых сцэнічных эцюдаў, затым пераходзілі на распрацоўку сцэнічных урыўкаў з класічных твораў рускай, замежнай і савецкай драматургіі, якія вымагалі ведання ролі, правільных узаемаадносін з партнёрам на сцэне. Так прыступка за прыступкай нарошчвалася лесвіца авалодання складанай сцэнічнай задачай—спектаклем. На ўсіх гэтых этапах вопытны педагог перадаў вучням свае веды, вучыў іх складанай навуцы—сцэнічнаму мастацтву. І ў аснове гэтай навукі ляжала сістэма акцёрскага майстэрства — сістэма К. С. Станіслаўскага і асабісты акцёрскі і рэжысёрскі вопыт кіраўніка. Вучоба грунтавалася на цвёрдых прынцыпах рэалізму.

І вось складаная лабараторная праца са студэнтамі закончана. Сёння яны іграюць спектакль, у якім кожны яго ўдзельнік павінен выявіць усё тое, што яму даў інстытут, глыбока і верна ўвасобіць свой вобраз, паказаць асабістыя акцёрскія здольнасці. Для гэтага выбрана п'еса М. Горкага, якая дае вялікія магчымасці для раскрыцця акцёрскіх здольнасцей.

...Прайшлі першыя мінуты хвалявання. Студэнты пачынаюць іграць. Зал усё больш і больш паглыбляецца ў жыццё горкаўскіх вобразаў, хвалюецца за іх лёс. Гледачы забылі, што гэта экзамен, што гэта дыпломны спектакль. Прафесіянальна, з майстэрствам выконвае ролю Паўла Пратасава студэнт А. Мілаванаў. Ён прымушае гледача верыць у тое, што робіць на сцэне. Студэнт І. Нагаўкін у ролі ўрача Барыса Чапурнага даносіць да залы складаныя ўнутраныя пачуцці шчыра закаханага чалавека. Разумовую нікчэмнасць і драпежную скваплівасць у вобразе Мішы Выгрузава востра выяўляе студэнт Л. Крук. Ролю хваравітай Лізы ігралі тры студэнткі Э. Шалапёнак, І. Геранбург і С. Карабіцына, якія па чарзе выступілі ў розных актах. Па-рознаму, але даволі глыбока кожнай з іх удалося выявіць унутраную трагедыю горкаўскай гераіні.

Не меншым поспехам карыстаюцца і іншыя выканаўцы спектакля—Ф. Варанецкі (Назар Аўдзеевіч), А. Масумян, Н. Фёдарава (Елена Мікалаеўна) і інш. Вобразы іх распрацаваны дастаткова глыбока, яны даносяць філасофскую горкаўскую думку і другі план сцэнічнага дзеяння. Знойдзены рад трапных сцэнічных дэталей, адчуваецца выразны падтэкст. Усе тры актрысы не парушаюць цэласнасці рэжысёрскай задумы.

У другім спектаклі «Дванаццатая ноч» В. Шэкспіра студэнты паказалі уменне валодаць сваім голасам, целам, спяваць, танцаваць, насіць касцюм, фехтаваць. Добрую камедыйную лёгкасць выявілі студэнты Н. Фёдарава і А. Масумян (Віола), А. Мілаванаў (Фестэ), І. Нагаўкін (Бэлч), Э. Шалапёнак і В. Санкоўская (Себасцьян) і інш.

Спектаклі паказалі падрыхтаванасць новага папаўнення маладых творчых кадраў для нашых беларускіх тэатраў. Аднак трэба заўважыць, што культура мовы студэнтаў пакідае жадаць лепшага. Асабліва гэта адчувалася на спектаклі «Дванаццатая ноч». Дасціпнасць шэкспіраўскага дыялогу ў многім траціла ад невыразнасці яго вымаўлення. Выкладчыкам і студэнтам трэба сур'ёзную ўвагу звярнуць і на вывучэнне беларускай мовы. Маладыя акцёры слаба ёй валодаюць, няправільна вымаўляюць словы. Кіраўніцтву інстытута варта ўлічыць недахоп і дамагчыся ліквідацыі яго ў працэсе навучання студэнтаў.

...Экзаменацыйная камісія абвяшчае вынікі абмеркавання. Работа педагога Д. Арлова і яго курса прызнана паспяховай. Вялікая колькасць студэнтаў атрымоўваюць высокія ацэнкі за выкананне роляў. Выпускнікам надаецца ганаровае званне драматычных акцёраў і ўручаюцца дыпломы. Шчыра дзякуе творчая моладзь сваім кіраўнікам і педагогам.

І яшчэ адна радасная падзея завяршае ўрачыстасць. Тэатр імя Я. Коласа бярэ ў свой калектыў увесь выпускны курс разам з іх дыпломнымі спектаклямі, якія ўвойдуць у рэпертуар. Гэта ўжо не першы выпадак у практыцы інстытута, калі беларускія тэатры бяруць цэлыя калектывы выпускнікоў. З іх калісьці пачалі сваё творчае жыццё Тэатр юнага гледача і Бабруйскі калгасна-перасоўны тэатр.

С. ПЯТРОВІЧ.

селены самымі рознымі героямі. Мы ўзялі толькі адну праблему, пакідаючы ўсе астатнія для тых, хто будзе пісаць падрабязную рэцэнзію.

II

Выкрыццё мяшчанства ў розных яго праявах (аўтар як бы прасочвае «радаслоўную» мяшчанскай хваробы ў душах людзей — былога парабка Нічыпара Метлюжка, былой пані Адзелаіды Дашынскай і яе дачкі Лілі) складае пафас новай аповесці Алеся Асіпенкі, надрукаванай у гэтым годзе ў «Маладосці». Аўтар імкнецца вырашыць тэму шырока, праб*лемна, паклаўшы ў аснову твора* розны лёс двух сялянскіх хлопцаў Рыгора Агнёва і Нічыпара Метлюжка.

Жыццё іх пачалося аднолькава, а потым шляхі парабкаў разыйшліся. Першы стаў свядомым рабочым, падпольшчыкам-рэвалюцыянерам, затым — адказным і ўсімі паважаным грамадскім дзеячом. Другі парадніўся з гаспадаром млына і ператварыўся ў яго хаўрусніка і паслугача. Пасля рэвалюцыі *ён нібыта і прызнаў савецкую* ўладу, але з тым, каб прыстасавацца да яе. Чалавек па-абывацельску дажыў да сталага веку і ні разу па-сапраўднаму не задумаўся аб сваім месцы сярод людзей, аб зменах, што адбываюцца навокал Была б лішняя чарка гарэлкі, добрая закусь, поўная кубышка грошай, — а там няхай сабе астатнія людзі ладзяць сваё жыццё, як каму хочацца.

Рыгор Агнёў шукаў новых шляхоў да лепшай долі для ўсіх людзей працы. Чалавек актыўны, неспакойны, сумленны ва ўсім і заўсёды, ён знайшоў тое, што шукаў. Нічыпар Метлюжок думаў толькі пра сябе. Ён не столькі ненавідзеў паноў, колькі зайздросціў ім. Такія людзі былі, яны не выдуманы аўтарам. Фальшывінка пачынаецца пазней, калі Рыгор і Нічыпар упершыню сустракаюцца пры савецкай уладзе — адзін у якасці адказнага мясцовага работніка, другі — у ролі фактычнага гаспадара пакінутага панам млына. У наяўнасці як быццам усе прыкметы часу: былыя гаспадары ўцяклі або пазашываліся ў розныя шчыліны; *з нетраў народа вылучаны здольныя* арганізатары вытворчасці; у вёсцы разгарнулася барацьба з кулацтвам; сацыялістычнаму сек*тару забяспечана поўная* перамога над прыватнымі ўласнікамі. Змянілася жыццё, змяніўся і Рыгор Агнёў Так, прынамсі, можна думаць. Але раптам ты заўважаеш, што герой амаль не вырас духоўна, не навучыўся разумець людзей і іх класавую, сацыяльную сутнасць, хоць аўтар усяляк падкрэслівае глыбокі розум і праніклівасць Рыгора Агнёва.

Млынар трапіў на прыём да Агнёва пасля канфлікту з фінансавым інспектарам. Трэба было плаціць падатак, а Нічыпар і слухаць не хацеў:

«— Няхай цесць разлічваецца... Гаспадаром млына з'яўляецца ён. А што млын на мяне перапісаў, дык зноў жа няхай людзі скажуць, як усё было. Аддаў млын у пасаг разам з дачкой. А яны мне патрэбны былі, як сабаку пятая нага».

З адказу Агнёва відаць, што гэты чалавек не навучыўся разгадваць сутнасць такіх людзей, як Нічыпар, які даўно страціў якасці рабочага чалавека і ператварыўся ў звычайнага мешчаніна:

«— *Як жа ты дакаціўся да такога жыцця? Рабочы чалавек,* а гонару ў цябе ні на грош. Прамарнатравіў столькі год... Людзі рэвалюцыю рабілі, а ты ў буржуя на задворках аціраўся... Ну, нічо*га, мы цябе вырвем з лап улас*ніцкіх настрояў. Пераварышся ты ў нашым пралетарскім катле».

Практычна справа закончылася тым, што Нічыпару намінальна прысвоілі званне загадчыка млына. А што змянілася? Млынар па-ранейшаму прадаваў цішком жыта, хаваў лішкі мукі, не прыходваў дзесяткі квітанцый. Праўда, перад вачыма стаяў прыклад сумленнага і бескарыслівага Рыгора Агнёва, і млынару часам здавала*ся, што і ён сам можа* стаць лепшым: «Адкінь прэч усе заганы, і ты будзеш Агнёвым». А тым часам камбінатар і круцель нават адчувае перавагу над неспакой*ным антаганістам, які стаў пенсія*нерам: «Рыгор Агнёў больш не начальнік. А я загадчык млына. Разам юшку варым, сварымся, мірымся, ловім рыбу. Можа і паміраць у адзін дзень давядзецца. Не, я пражыву болей. Куды Агнёву да мяне. Растрос сваё здароўе па крутых дарогах. А навошта? Усё роўна ў адным чыгуне рыбу варым. Навошта несці на сваіх плячах непасільны цяжар, калі можна пражыць весялей».

Псіхалагічны канфлікт паміж *камуністам Рыгорам і абывацелем Нічыпарам патрабаваў* нейкага вырашэння. Не мог жа аўтар пакінуць усё, як яно ёсць. Тады прыватнаўласніцкая тэндэнцыя засталася б непахіснай. Канфлікт фармальна вырашаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу. Абывацель церпіць паражэнне, праўда, толькі ў чыста псіхалагічным плане. Навакольнае жыццё так і не зрабіла на Нічыпара ніякага ўплыву. Ён па-ранейшаму меле *для калгасаў і калгаснікаў і зусім* не цікавіцца зменамі, што адбываюцца ў вёсцы, новымі павевамі часу.

Паварот у свядомасці Нічыпара пачаўся з таго, што ён сустрэў былую жонку, знайшоў дачку, заўважыў, што і ёй жывецца нялёгка. Ды, можа, і павароту асаблівага не было. Спачатку Нічыпар зусім так, як стары Стафановіч з аповесці Кузьмы Чорнага «Люба Лук'янская», хацеў дапамагчы блізкім людзям, нават «адамкнуў скрыню, дастаў скрутак, асцярожна разгарнуў анучку. Грошы пахлі нафталінам і цвіллю... Ён аддзяліў пяць паперак, паклаў іх у кішэню... Толькі які падарунак лепей купіць? Дачцы ці ўнукам. Вядома, унукам». Потым прыйшла думка, што не варта прапаноўваць дачцы і ўнукам свой падарунак: пойдзеш купляць дарагія гарнітуры дзецям — могуць заўважыць, распачнецца гаворка, стануць цікавіцца другім жыццём млынара, схаваным ад сумленных людзей. Была думка здаць грошы ў кантору прамкамбіната, але і на гэта не хапіла адвагі, калі яму сказалі, што на месцы млына пабудуюць электрастанцыю, а яго, Нічыпара, як чалавека сталага і сумленнага, прызначаюць прарабам на будаўніцтва новага млына. Так, па сутнасці наперакор аўтарскай задуме, рэабілітавана пражытае фальшыва, па-абывацельску, жыццё. Канфлікт у творы не вырашаны.

*Аўтару ўдаліся ў аповесці воб*разы кулака Тараса Тарасавіча, паніча Залуцкага, мяшчанкі з былых паноў Адзелаіды Дашынскай і яе дачкі Лілі. Праўда, пісьменніку не хапіла майстэрства, пачуцця мастацкага такту, умення глыбока разабрацца ў складаных чалавечых характарах, і таму ў аповесці многае спрошчана, зроблена прымітыўна. Спрошчаны, як мы ўжо гаварылі, канфлікт паміж перадавымі людзьмі і *мяшчанствам, абывацельшчынай.* Многа прымітыву ва ўспамінах старога камуніста Рыгора Агнёва, які піша мемуары, каб перадаць моладзі сваю нянавісць да варожай нам ідэалогіі і яе носьбітаў. Бяда ў тым, што ў сваіх успамінах Агнёў пераскаквае з пятага на дзесятае і ніяк не можа ўхапіцца за нейкую галоўную, самую важную думку. Пра цікавае жыццё напісана нецікава, шэра, і яно не становіцца тым станоўчым прыкладам, якім магло б стаць, калі б пісьменніку не бракавала *майстэрства.*

III

Бяскроўную бітву з уласніцтвам, мяшчанствам вядуць і героі аповесці Аляксея Кулакоўскага «Тут я жыву». Арэнай, дзе сутыкнуліся супрацьлеглыя чалавечыя інтарэсы, на гэты раз з'яўляецца будаўніцтва першага ў рэспубліцы горада шахцёраў. Аляксей Кулакоўскі адным з першых прыцягнуў такі новы, некрануты жыццёвы матэрыял. Важна, што многае яму ўдалося.

Сцежкі-дарожкі, якія прывялі галоўнага героя аповесці Якава Сямігона на вялікую будоўлю, *былі даволі пакручастыя: сіро*тва, апека партызанскага атрада, выхаванне ў дзіцячым доме, як па заказу няўдала падабраныя службы, *што давалі кавалак хле*ба, але не прыносілі ніякай душэўнай радасці. Аўтар, мабыць, перабраў меру, завельмі ўскладняючы біяграфію героя. Не абавязкова было рабіць здаровага, поўнага сіл юнака памочнікам вартаўніка на могілках, прымушаць яго нібы знарок хадзіць каля вады і пакутаваць ад смагі. Кіраваўся пісьменнік зусім слушным меркаваннем: нішто не бывае больш сумным і нецікавым за адналінейную біяграфію пай-хлопчыка, якому нават яечка падаецца аблупленым. Якаў Семігон належыць да тых герояў, якія ў сваіх пошуках зведалі і каштоўныя знаходкі і горкія страты, набывалі пры гэтым жыццёвы вопыт, пазнавалі людзей, набівалі сабе гузы, калі даводзілася браць розныя бар'еры.

Ці быў падрыхтаваны Якаў, каб адразу ж, без далейшых пошукаў знайсці самога сябе ў якасці актыўнага і свядомага ўдзельніка ўсенароднай будоўлі? Не, такой папярэдняй падрыхтоўкі герой не меў. Ён яшчэ насіў у сабе ладны зарад індывідуалізму. Былі, праўда, парыванні да лепшага, падсвядомае імкненне штосьці змяніць у сваім жыцці, адарвацца ад зялёнага доміка, гаспадары якога абражалі чалавечую годнасць шафёра персанальнай машыны. Паратункам стаў шахтабуд, хоць Якаў спачатку і не разумеў, што нарэшце знойдзе тут самае дарагое, самае важнае для чалавека — радасць творчай працы, адчуванне асабістай і калектыўнай адказнасці за шахцёрскую славу рэспублікі. Раней Якаву было няўцям, што толькі ў калектыве ён знойдзе сваё шчасце. Не разумеў ён і таго, што перш за ўсё, каб стаць чалавекам, яму трэба пераадолець мяшчанскі індывідуалізм у ім самім і ў многіх людзях, побач з якімі ён працуе. Гэта не парадокс. Якаў, які ніколі не меў ні кала, ні двара і перабіваўся з хлеба на квас, на*сіў у сабе бацылу індывідуалізму,* бо пакуль малады чалавек крочыў па абочынах жыцця, ён думаў толькі аб лягчэйшым хлебе, добрым заробку, асабістым дабрабыце. Калі б не гэта, наўрад ці згадзіўся б ён стаць падручным у вартаўніка могілкаў, цэлы год прыслужваць не толькі нейкаму дурному і беспрынцыпнаму чыноўніку, але і яго жонцы-мяшчанцы і іх нашчадку.

Пісьменніку ўдалося паказаць, *што на шахтабудзе,* сярод рабочых людзей, з якіх паступова складваўся новы калектыў, Якаў упершыню ўбачыў сапраўдную ўзаемадапамогу, бескарыслівасць, свядомыя адносіны да працы. Але і тут разам з сумленнасцю многіх герой заўважыў крывадушнасць адзінак, побач з калектывізмам — самыя агідныя формы дробнабуржуазнага ўласніцтва, нікчэмнасці інтарэсаў. Хоць такіх адсталых і несумленных людзей на будоўлі было мала і не яны задавалі тон, *Якаву давялося асабіста скрыжа*ваць з імі шпагі, памерацца сіламі і тым самым загартаваць свой чалавечы характар. У гэтай бітве *былі два этапы. Спачатку* Якаву здалося, што ён адзін, без староннай дапамогі выкрые махляроў Шыпульку і Шымета. Спрактыкаваныя ашуканцы маглі тады не баяцца, бо і не такіх людзей яны збводзілі вакол пальца. Калі ж Якаў знайшоў супольнікаў і аднадумцаў, прыслухаўся да камсамольцаў, займеў саюзнікаў сярод сталых рабочых, якія ведалі цану кладаўшчыку Шымету і яго памагатым, перамога была забяспечана. Гэта і перамога пісьменніка, якому ўдалося паказаць, як пад уплывам новых абставін гартуецца чалавечы характар, пераадольваюцца адсталасць, індывідуалізм, мяшчанская замкнутасць. Прыклад таму — вобраз Якава, чалавека, які пераадолеў такія хібы ў самім сабе і стаў актыўным барацьбітом за новыя адносіны паміж людзьмі.

Героі Аляксея Кулакоўскага вядуць змаганне супраць мяшчанства, уласніцтва, супраць усіх тых, хто не разумее або не хоча зразумець, што не «маё», а «наша» з'яўляецца крыніцай чалавечага шчасця, гарантыяй усеагульнага дабрабыту. Аўтар як бы імкнецца сказаць, што матэрыяльныя каштоўнасці нашых заводаў, фабрык, саўгасаў, калгасаў, устаноў, грамадскіх арганізацый ахоўваюцца не толькі штатнымі вартаўнікамі. Лепшая ахова — сама свядомасць людзей, якая не дапускае каб «наша» для кагосьці стала «маім».

* * *

Прыцэльны агонь па ўласніцтву, мяшчанству, абывацельшчыне, які вядзецца названымі пісьменнікамі, не ўсюды дасягае мэты, у паасобных выпадках бываюць пералёты і недалёты. Выкрыццё мяшчанства патрабуе страснасці пісьменніцкай пазіцыі, адчування духу часу, жыццёвасці канфліктаў і характараў, глыбокага пранікнення ў псіхалогію чалавека — толькі так можна выкрыць страшную хваробу ўласніцтва, яго «радзімыя плямы».

Ул. Карпаў, глыбока зазірнуўшы ў душу мяшчанкі Веры Антонаўны, не здолеў, аднак, гэтак жа глыбока паказаць, як адбылося душэўнае адраджэнне Максіма Сцяпанавіча, чалавека, які доўгі час быў пад уплывам жаночых густаў, інтарэсаў і г. д. Алесь Асіпенка, узяўшы тэмай аповесці выкрыццё мяшчанства, спрасціў вырашэнне праблемы, перавёўшы яе ў план чыста псіхалагічны, між тым як грунтоўна ўзнятая тэма патрабавала мастацкага даследавання больш шырокага, а іменна — **сацыяльна-псіхалагічнага,** абавязкова патрэбен быў **грамадскі** план у вырашэнні гэтай тэмы. Трохі па-іншаму падышоў А. Кулакоўскі да выкрыцця чалавечага індывідуалізму, эгаізму: яго цікавіў чалавек, які, выблытаўшыся з цянётаў індывідуалізму, стаў актыўным змагаром супраць варожых нашаму *грамадству мяшчанскіх адносін* да жыцця.

Недахопы, якія ўласцівы тром названым творам, вынікаюць, па-першае, з таго, што аўтары свае адносіны да мяшчанства, самі па сабе пэўныя, прынцыповыя, не ўсюды здолелі выказаць па-мастацку паслядоўна і глыбока. Тут мы маем справу з недахопам майстэрства. Па-другое, як мы бачылі ў выпадку з творамі Ул. Карпава і А. Асіпенкі, матывіроўкам паводзін герояў, сюжэтным калізіям часта не хапае жыццёвай праўдзівасці, сацыяльнай атмасферы, аб'ёмнасці.

Толькі ў рознабаковым, глыбокім і актыўным аналізе фактаў жыцця, спалучаным з высокім майстэрствам, — сакрэт творчага поспеху пісьменніка.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

СПРАВА ПОЙДЗЕ НА ЛАД

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

30 мая г. г. у нашай газеце быў змешчаны артыкул Г. Загароднягa «Грампласцінка і напластаванні на ёй». Намеснік міністра гандлю БССР Л. Наркевіч паведаміў рэдакцыі, што гэты артыкул абмяркоўваўся ў Міністэрстве гандлю на спецыяльнай нарадзе пры ўдзеле работнікаў Белкультгандлю і Дома грампласцінак і прызнаны правільным.

Міністэрства гандлю абавязала Дом грампласцінак з першага верасня г. г. пачаць праводзіць падпіску на грампласцінкі з запісамі класічнай музыкі і твораў беларускіх кампазітараў, у сувязі з чым да 10 жніўня падрыхтаваць і разаслаць усім гандлёвым арганізацыям праспекты на грампласцінкі. У далейшым падпіску праводзіць перыядычна — адзін раз у квартал з тэрмінам выканання не больш двух месяцаў.

У мэтах папулярызацыі беларускай музыкі правесці ў кастрычніку гэтага года ў Доме грампласцінак дзень сустрэчы пакупнікоў з кампазітарамі рэспублікі. Праводзіць не менш двух разоў на год канферэнцыі пакупнікоў, на якіх праслухоўваць новыя пласцінкі.

Сёлета правесці выстаўкі продажу грампласцінак: у ліпені — у Гомелі, у жніўні — у Мінпрамгандлі, у верасні — у Гродна.

Да пачатку 1962 г. пераабсталяваць і пашырыць салон па продажу грампласцінак.

У ліпені — жніўні г. г. закупіць і завесці ў гандлёвыя арганізацыі патрэбны асартымент пласцінак.

На гэты ж артыкул атрымана рэагаванне ад Упраўлення па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР. Намеснік начальніка упраўлення Я. Рамановіч піша, што, каб палепшыць прапаганду беларускай грампласцінкі гандлёвымі арганізацыямі, упраўленне сістэматычна складае для іх рэкамендацыйныя спісы нова запісаных твораў. Што датычыць вытворчасці грампласцінак, дык Упраўленне па справах мастацтва ставіла пытанне аб рэарганізацыі цэха грампласцінак і прымае далейшыя захады па паляпшэнню іх выпуску.

ЧАЛАВЕК У ЧОРНЫХ АКУЛЯРАХ

Жыве ў саўгасе «Рудзенскі» у Пухавіцкім раёне. чалавек, які хварэе на асобы від дальтанізму. Зрок у яго такі, што ў нашым багатым насычаным цікавымі і значнымі падзеямі жыцці ён бачыць адны толькі недахопы, адрознівае толькі чорныя фарбы.

У адным з аддзяленняў саўгаса пабудавалі клуб.

Былы пастух стаў аграномам.

Даярка заканчвае завочна сельскагаспадарчую акадэмію.

У брыгадзе поўнасцю механізавана праца па ўборцы збожжавых.

Дзесяткі, сотні, тысячы падобных падзей адбываюцца ўсюды, радуюць сэрца нашых людзей, прымушаюць селькораў брацца за пяро, каб паведаміць чытачам газет і часопісаў чарговую радасную навіну. А чалавек з сапсаваным зрокам нічога гэтага не заўважае. Яго ўвагу прыцягваюць адны толькі недахопы. Толькі пра іх, спісваючы пуды паперы, піша ён многа год запар.

Завуць гэтага чалавека Н. С. Піскуноў. У свой час ён набыў усесаюзную вядомасць. Гэта пра яго, Піскунова, быў надрукаваны ў 1953 годзе фельетон в «Известиях». На нейкі час Піскуноў прыціх, моўчкі перажываючы сваю скандальную славу. А потым зноў узяўся за сваё.

Размах «дзейнасці» Піскунова такі, што ён літаральна не дае перадыху рэдакцыям многіх саюзных і рэспубліканскіх газет, дзесяткам розных арганізацый. У адной установе паклалі на вагі пісаніну Піскунова і аказалася, што важыць яна ні многа ні мала — адзін кілаграм восемсот пяцьдзесят грамаў. А гэта была «прадукцыя» ўсяго толькі некалькіх тыдняў!

У Пухавіцкім райкоме партыі мне паказалі дзве папкі. У адной з іх пісьмы працоўных з усяго раёна. На другой папцы (яна трошкі меншая за першую) напісана: «Пісьмы Піскунова».

У нас існуе добрая звычка, па якой на кожнае пісьмо працоўнага своечасова рэагуюць. Гэтаму вучыў нас Уладзімір Ільіч Ленін. І мы свята следуем гэтаму залатому правілу. Але знаходзяцца яшчэ людзі, падобныя Піскунову, якія гэтым фактычна спекулююць у сваіх карыслівых мэтах. Гора таму рэдактару, які па якой-небудзь прычыне забавіўся і не паспеў своечасова адказаць на чарговы паклёп Піскунова! Вось які «разнос» зрабіў Піскуноў рэдактару аднаго рэспубліканскага часопіса: «Таварыш рэдактар! Я напісаў на ваша імя пісьмо... Прайшоў месяц, а адказу ўсё няма. Вы мяне вельмі зняважылі, што несумяшчальна з нашай канстытуцыяй».

Дрэнны работнік і нікчэмны чалавек Піскуноў клянецца Канстытуцыяй! Яго, бачыце, зняважылі! Між тым, у гэтым часопісе, як і ў дзесятках іншых друкаваных органах, добра вядома, што за птушка такая — Піскуноў. Цэбры бруду вылівае ён ледзь не штодзённа на дырэктара саўгаса, на брыгадзіраў, на ўпраўляючага, на рабочых, якія лічаць за няшчасце працаваць з ім у адной брыгадзе.

У большасці выпадкаў Піскуноў хлусіць. Вось ён напісаў пісьмо ў рэдакцыю рэспубліканскай газеты пра тое, што ў аддзяленні саўгаса не паказваюць фільмы. Паехалі, праверылі. І што ж? Аказалася, што за два месяцы, якія меў на ўвазе Піскуноў, у адной толькі вёсцы Капейнае, дзе жыве аўтар паклёпу, было паказана дзесяць фільмаў. Калі кінамеханік Мікалай Данілавіч Лобач даведаўся пра чарговае паклёпніцкае пісьмо Піскунова, абурэнню яго не было краю.

— Брахун, — сказаў ён, — свет такога не бачыў. Сёння я вязу фільм у Капейнае. Сілай зацягну на сеанс гэтага паклёпніка!

Аб тым, што ў пісьмах Піскунова мала праўды, ведаюць усе. Тым не менш, раз пісьмо прыйшло ў рэдакцыю або ва ўстанову, на яго абавязкова трэба рэагаваць. І дзесяткі людзей пішуць, звоняць па тэлефоне, адпраўляюцца ў камандзіроўкі, трацяць дарагі час, энергію, дзяржаўныя грошы, едуць правяраць «скаргі» Піскунова.

Не так даўно ў Капейнае прыехаў работнік абкома прафсаюзаў работнікаў сельскай гаспадаркі тав. Руцэвіч. Праверыў і ўпэўніўся: няма ў пісаніне Піскунова праўды. Але што скажуць рабочыя? І вось адбыўся сход прафгрупы шостай брыгады аддзялення «Цэнтральнае». На парадку дня стаяла пытанне аб ходзе веснавой сяўбы і пасадцы бульбы. Зайшла размова аб працоўнай дысцыпліне. Перада мной пратакол сходу. Там чорным па беламу запісана: «Дысцыпліна ў брыгадзе добрая. Усе акуратна выходзяць на працу і выконваюць свае нормы. Адзіным парушальнікам дысцыпліны з'яўляецца Піскуноў, які часта без уважлівых прычын не выходзіць на працу... А пасля к нам у брыгаду і на аддзяленне прыязджаюць прадстаўнікі партыйных і прафсаюзных арганізацый правяраць факты, пра якія піша Піскуноў ва ўсе газеты Масквы і Мінска. Піскуноў скажае сапраўднае становішча спраў у брыгадзе... Ён несумленны чалавек, самавольна захапіў грамадскія сенакосныя ўгоддзі, а калі зімой другім рабочым цяжка было пракарміць сваіх кароў, ён прадаваў сваім суседзям сена, якое накасіў на землях саўгаса». У сваіх выступленнях рабочыя гаварылі, што «пара Піскунова прыцягнуць да адказнасці, каб ён не адрываў сваёй пісанінай людзей ад працы».

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што калі-нікалі Піскуноў піша пра факты, якія сапраўды маюць месца ў жыцці. У саўгасе не абходзіцца справа без недахопаў. Аб гэтым пішуць і будуць пісаць сумленныя працаўнікі саўгаса. Пісьмы сельскіх карэспандэнтаў дапамогуць гэтыя недахопы ліквідаваць. А што прымушае пісаць Піскунова? Які ў яго, так сказаць, «творчы стымул».

Піскуноў патрабуе, каб яго прызначылі ў саўгасе то брыгадзірам, то кладаўшчыком, то бухгалтарам. А калі гэтае патрабаванне не задавальняюць, ён пагражае і строчыць, строчыць, строчыць паклёпы.

Вось вытрымка з пісьма Піскунова былому дырэктару саўгаса Тарасаву: «Аляксей Мікалаевіч! Я падаў заяву, у якой прасіў вас прызначыць мяне брыгадзірам у Капейнае, але да гэтай пары не атрымаў станоўчага адказу. У чым справа? Я вас, здаецца ніколі не зачапіў... Я вырас разам з братамі вашай жонкі Аляксеем і Міхасём. Ваш цесць працаваў з маім бацькам на чыгунцы...». Гэтае «гістарычнае» пісьмо захоўваецца ў Пухавіцкім райкоме партыі. Знамянальны ў ім словы « я вас яшчэ не зачапіў». Піскуноў дае зразумець, што калі яго патрабаванне не будзе задаволена, то ён «зачэпіць» дырэктара, — напіша ва ўсе інстанцыі пра тое, што дырэктар прайдзісвет, хуліган і яго трэба тэрмінова зняць з работы. А пакуль ёсць сэнс «прашчупаць» дырэктара, напомніць яму пра блізкія сувязі — можа, Тарасаў клюне на гэту вудачку. Дырэктар не клюнуў. І Піскуноў абліў яго брудам у дзесятках пісем, пасланых у розныя арганізацыі.

Аднойчы Піскуноў, што называецца, намацаў слабінку. Знайшліся неразумна даверлівыя людзі, якія дапамаглі яму ўладкавацца намеснікам старшыні цяпер не існуючага калгаса «Першае мая». І тут адбылося цуда. Піскунова нібы падмянілі. Ён, як па чарадзейству, перастаў пісаць.

Кіраўнік з Піскунова атрымаўся нікчэмны. Давялося вызваліць яго з гэтай пасады. Тады няўдалы намеснік старшыні зноў узяўся чарніць усіх, хто толькі пападаўся яму пад руку. Шкадуючы аб страчанай пасадзе, ён доўга яшчэ падпісваўся пад сваімі паклёпамі: «былы намеснік старшыні калгаса».

Піскуноў гультай. Часта, замест таго, каб працаваць у брыгадзе, ён ходзіць па саўгасе з сшыткам у руках, збірае «матэрыял».

Зараз, калі я пішу гэтыя радкі, камусьці выпісваюць камандзіроўку па «справе Піскунова». На пошце штампулююць канверты з чарговымі паклёпамі Піскунова. У розных установах складаюць Піскунову адказы.

А Піскуноў усё піша.

Я таксама атрымаў камандзіроўку «па справе Піскунова». Я, як і многія мае папярэднікі, правяраў, расследаваў, вывучаў «карэспандэнцкую» дзейнасць Піскунова. Мне хочацца думаць, што дзяржаўныя грошы, якія я патраціў на паездку ў саўгас «Рудзенскі», не прападуць дарэмна. Можа, прачытаўшы гэты артыкул, Піскуноў, нарэшце, здыме чорныя акуляры, праз якія ён глядзіць на белы свет.

Ул. ВАРНО,
спец. карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».

ПАМЯЦІ ХЕМІНГУЭЯ

У амерыканскім гарадку Сан-Вэлі (штат Айдаха) у выніку няшчаснага выпадку загінуў Эрнест Хемінгуэй. Перастала біцца сэрца цудоўнага мастака слова, мужнага чалавека, гуманіста, непрымірымага ворага фашызму і вайны.

Салдат, спартсмен, паляўнічы, журналіст, вялікі пісьменнік, Хемінгуэй пакінуў людзям кнігі, якім у сусветнай літаратуры належыць адно з пачэсных месц.

Пісьменнік, складаны жыццёвы і творчы шлях якога абарваўся так трагічна, дарагі мільёнам чытачоў таму, што ён чэсна і таленавіта, з вялікім тэмпераментам і праўдзіва тварыў дзеля жыцця на зямлі.

Савецкаму чытачу шырока вядомы такія яго творы, як раманы «Фіеста», «Бывай, зброя!», «Смерць апоўдні», «За ракою, у засені дрэў», раздзелы з рамана «Небяспечнае лета», аповесці «Мець і не мець», «Стары і мора», п'еса «Пятая калона», шматлікія навелы, кніга «Зялёныя ўзгоркі Афрыкі», публіцыстычныя выступленні.

Нарадзіўся Хемінгуэй 21 ліпеня 1899 г. непадалёк ад Чыкага ў сям'і ўрача. Дзевятнаццацігадовым юнаком, у 1918 г., ён уступіў добраахвотнікам у італьянскую армію. Там упершыню і навучыўся ненавідзець вайну. У пачатку 20-х гг. Хемінгуэй карэспандэнт амерыканскіх і канадскіх газет у Еўропе. У Парыжы ў 1926 г. публікуе першы раман — «Фіеста» («І ўзыходзіць сонца») Ужо сусветна вядомым пісьменнікам Хемінгуэй ідзе добраахвотна змагацца за Іспанскую рэспубліку. У гады другой сусветнай вайны ён — ізноў ваенны карэспандэнт. Пасля вайны большасць часу жыў паблізу Гаваны на Кубе, быў блізка знаёмы з Фідэлем Кастра.

Хемінгуэй шмат падарожнічаў. Многа разоў ён быў паранены ў часе войнаў.

Адзін з удзельнікаў барацьбы ў Іспаніі, ад'ютант генерала Лукача так пісаў пра Хемінгуэя: «Ён любіў Іспанію і цудоўна ведаў яе... Хемінгуэй быў з ёю заўсёды. Большая частка яго творчасці прысвечана Іспаніі, яе прыродзе. яе народу. Можна сказаць, што ён сам напалавіну іспанец: іспанская мова — яго другая мова, іспанскія песні і танцы ён ведае як вучоны фальклярыст. У баі быкоў ён, як і іспанцы, адчувае трагічную містэрыю...»

Яшчэ любіў ён Афрыку, цудоўна пісаў аб яе простых людзях.

Штат Айдаха таму і падабаўся яму, што там ёсць мясціны, якія нагадваюць Іспанію і Афрыку.

Сярод сваіх літаратурных настаўнікаў Хемінгуэй называў Тургенева, Талстога, Дастаеўскага, Чэхава.

Ён меркаваў пабываць у Савецкім Саюзе, дзе ў яго многа сяброў сярод савецкіх пісьменнікаў. Ён меркаваў напісаць пра кубінскую рэвалюцыю...

У сваёй прамове «Пісьменнік і вайна», сказанай у 1937 г. на II кангрэсе амерыканскіх пісьменнікаў, Хемінгуэй гаварыў як пра цудоўны прыклад, дастойны пераймання,— пра англійскага пісьменніка-камуніста Ральфа Фокса, які загінуў у баях за Іспанію.

Войны пакідалі шрамы на целе і на сэрцы Хемінгуэя. У яго быў вялікі рахунак да войнаў. Таму лёгка зразумець, чаму ў 1948 г. ён прапаноўваў у першы ж дзень вайны расстраляць яе зачыншчыкаў па прыгавору народа.

Тэма, якая праходзіць праз усю яго творчасць,— чалавечая мужнасць. За гэта і любяць пісьменніка чытачы ўсяго свету. А гэтая любоў — зарука бяссмерця Хемінгуэя...

Ул. БРЫГ.

З СЭРЦАМ І ПЕРЦАМ

Літаратурныя пародыі

ПРЫЗНАННЕ У ЛЮБВІ

Люблю цябе.
Мая старонка:
Бяжыць бальшак,
Пыліць трохтонка.

А. Дзеружынскі.

Люблю цябе,
Мая старонка:
Бяжыць бальшак,
Пыліць трохтонка.
З-пад колаў пыл ірвецца
скруткам.
Клубіцца ўвысь за валам вал.
І тоне ў ім, нібы малютка,
40-тонны самазвал.
Мяне расчульвае да слёз
Суччо скарэжаных бяроз.
Пыл усцілае, кветкі, травы
Палеткі покрывам густым.
Люблю ўдыхаць я пыл гаркавы,
Гаркавы пыл і бензадым.
Калі ж купчасты хвост развесіць
Стары знаёмы ЗІС-110,
За ім пылю я шмат гадзін
То ў «Масквічы», то ў Л-1.
Ку-ку! —
Зязюля лічыць звонка.
Пыліць бальшак:
Бяжыць трохтонка.

РОДНЫЯ З'ЯВЫ

(А. Русак)

Ранак духмяны.
Водар паляны.
Дзеўчына. Хлопец Вясна.
Росныя травы.
Позірк ласкавы.
Дзынкнула ў сэрцы струна.

Спеў салаўіны.
Хлопец з дзяўчынай.
Месяц плыве малады.
Важкія зоры.
Ціша. Прасторы.
У квецені млеюць сады.

Новая хата.
Снежань багаты.
(Час пралятае няўзнак).
Песні. Гаворка.
Гучнае «горка!»
Трэпле чачотку Русак.

Ягор **КУДРЫЦКІ.**

ДЫЛОГІЯ ПРА ЭЛІЗУ АЖЭШКУ

У друку паведамлялася («Літаратура і мастацтва» за 17 мая 1960 г.), што польская пісьменніца Габрыэля Паўшэр-Кляноўская напісала пра дзіцячыя і дзявочыя гады, а таксама пра пачатак творчай сталасці Э. Ажэшкі біяграфічную аповесць «Пані Эліза», дзе многа цікавых старонак прысвечана сувязям выдатнай пісьменніцы-рэалісткі з беларускім народам, з асобнымі прадстаўнікамі яго культуры. Некаторыя факты і матэрыялы былі выкарыстаны ўпершыню.

У апошні час Г. Паўшэр-Кляноўская працавала над працягам аповесці. І вось літаральна днямі ў Польскай Народнай Рэспубліцы выйшла з друку другая яе частка — «Святло з-над Нёмана». Яна таксама заслугоўвае ўвагі беларускага чытача.

У другой частцы дылогіі апавядаецца пра годы жыцця Элізы Ажэшкі ў Гродна, калі яе творчасць стала шырока вядомай не толькі сярод польскага народа, калі пісьменніца звярнулася да вывучэння побыту беларускага сялянства і гарадской беднаты. У гэты час яна стварае такія свае лепшыя рэалістычныя творы, як апавяданні зборніка «З розных сфер», раманы «Над Нёманам», «Нізіны», «Дзюрдзі», «Хам», піша крытычныя і публіцыстычныя артыкулы. Паўшэр-Кляноўская падкрэслівае, што ўсё гэта ўзнікла ў выніку знаёмства Элізы Ажэшкі з тагачаснай беларускай рэчаіснасцю. «Падарожжы па жабрачых вулачках Гродна, — чытаем у аповесці «Святло з-над Нёмана», — адкуль пісьменніца штодзённа вярталася, узбагачаная новымі назіраннямі і новай дружбай з простым народам, сталі для яе невычэрпнай крыніцай ведаў аб жыцці, а таксама крыніцай натхнення». Імя Элізы Ажэшкі было папулярным на Гродзеншчыне. «Наведвалі пісьменніцу ўсе,—піша Паўшэр-Кляноўская,— гродзенскія яўрэі, сярод якіх яна мела адданых сяброў, дробнапамесная шляхта з прыгарадных ваколіц, урачы і адвакаты, студэнцкая моладзь, якая прыязджала сюды на канікулы, а таксама рускія, якіх многа жыло ў Гродна». Цесная сувязь Ажэшкі з грамадствам спрыяла таму, што яе творы станавіліся больш вострымі, надзённымі. Яны неаднаразова моцна закраналі мясцовую арыстакратыю. Так, гродзенская «мецэнатка» Міхаліна Залеская, якая здзекавалася са сваёй выхаванкі Стэфкі Бучынскай, пазнала сябе ў ажэшкаўскім апавяданні «Добрая пані».

Пісьменніца змагалася з сацыяльным і нацыянальным прыгнётам не толькі мастацкім словам — яна сама актыўна ўмешвалася ў падзеі. Напрыклад, пасля славутага гродзенскага пажару, які знішчыў 17 вуліц і ў тым ліку дом пісьменніцы, Ажэшка арганізавала камітэт дапамогі пагарэльцам. У камітэце яна рашуча змагалася з шавіністамі, якія патрабавалі дапамагаць толькі каталікам. Ажэшка клапацілася і пра тое, каб у рамізніка-пагарэльца Левандоўскага быў свой конь, і пра тое, каб мог лячыцца муляр Чарняўскі, але яна разумела, што толькі такімі філантрапічнымі паўмерамі жыццё не палепшыш— патрэбны больш рашучыя дзеянні.

Цікава піша Паўшэр-Кляноўская і пра выдавецкую дзейнасць Ажэшкі, пра кнігарню, якую яна заснавала ў Вільні. Адсюль у самыя аддаленыя куткі Беларусі распаўсюджваліся лепшыя творы тагачаснай польскай і зарубежнай літаратур, у тым ліку антыклерыкальныя «Драматычныя фрагменты» Канапніцкай. Упаўнаважаныя кнігарні развозілі выданні па вёсках, прыкрываючыся ад паліцыі пасведчаннем на права «мелочной торговли». Варта адзначыць, што пасля ліквідацыі кнігарні царскімі ўладамі значная частка кніг з яе была перададзена ў Мінск, у краму Савіцкай.

Найбольш цікавы для нас раздзел аповесці — «Сярод беларускага народа». Грунтуючыся на архіўных матэрыялах, на багатай эпісталярнай спадчыне Ажэшкі, асабіста пазнаёміўшыся з жыхарамі Міневіч і іншых беларускіх вёсак, Паўшэр-Кляноўская красамоўна расказала пра ўзаемаадносіны пісьменніцы-дэмакраткі з беларускім сялянствам. Мы даведваемся з гэтага раздзела, што галоўныя персанажы «Нізін», «Дзюрдзяў», «Хама», «Над Нёманам», «Бэнэ наці», «Гэдалі» мелі канкрэтных прататыпаў. Так, аднойчы Ажэшка сустрэла ля Міневіч сялянку, якая «выказала сваю просьбу меладычнай гаворкай, так характэрнай для беларускай мовы». Яна прасіла грошай, каб паехаць у Гродна развітацца з сынам-рэкрутам. Сцэна гэтая ў цэлым напісана прачула. Шкада толькі, што аўтар прымушае тут сялянку праспяваць беларускую народную песню «Ой, у лузе, пры дарозе расцвіла каліна». Эфект, шчыра кажучы, танны; наўрад ці да песні было жанчыне пры такіх цяжкіх абставінах.

Ёсць рэальныя прататыпы і ў беларускай сялянкі Пятрусі з рамана «Дзюрдзі». Ля Міневіч жыла Марыся Карасёва, якая ведала ўласцівасці розных зёлак і любіла спяваць песні. Жыхары навакольных вёсак лічылі яе ведзьмай. Аднак сам факт забойства сялянкі п'янымі цемрашаламі здарыўся ў іншым месцы; пра гэта Ажэшцы расказаў яе муж, адвакат Нагорскі. Тут жа, у Міневічах, пісьменніца пазнаёмілася са збяднелымі шляхцічамі Багатыровічамі, слухала песні і апавяданні Адама Ляўковіча. Потым гэтыя ўражанні ляглі ў аснову рамана «Над Нёманам». Прататыпам Андрэя Карчынскага быў гаспадар Міневіч, удзельнік паўстання 1863 г. Ян Каменскі. Задума рамана «Хам» зарадзілася таксама ў Міневічах. Правобразам Паўла Кабыцкага стаў селянін з суседняй вёскі Паніжаны. Спачатку раман павінен быў называцца «Наднёманскія рыбакі». Але якраз выйшаў пераклад рамана Лоцці «Ісландскі рыбак» — і загаловак давялося змяніць. Цікава, што Ажэшка паказвала Канапніцкай, калі тая прыязджала ў Гродна, жанчыну ў вар'яцкім доме, якая паслужыла прататыпам вобраза Франкі. Толькі гераіня рамана не вар'яцее, а канчае жыццё самагубствам.

Паўшэр-Кляноўская выкарыстоўвае многа новых або маладомых фактаў, якія сведчаць, што творчасць Ажэшкі была добра вядома на ўсёй беларускай зямлі. Так, пасля рамана «Над Нёманам» адна жанчына з Беларусі «дзякавала пісьменніцы за дабратворны ўплыў, які гэты раман аказаў на яе маладых сыноў». А аднойчы ў Вільні да Ажэшкі падышоў юнак Шлёма Шэндар з Мазыра і сказаў, што ён пачаў вучыцца наперакор волі бацькоў, прачытаўшы раман «Меір Езофовіч» у рускім перакладзе. Прыгадваючы гэтую сустрэчу, Ажэшка зазначала ў адным з пісьмаў: «Мой Меір быў яўрэем, мой Хам беларусам, значыць, я напалавіну полька». Але асаблівым праяўленнем павагі перадавых колаў грамадства да вялікай пісьменніцы было святкаванне ў Гродна дваццаціпяцігадовага юбілею яе творчай дзейнасці. Паўшэр-Кляноўская сцвярджае, што 6 лютага 1892 г. на ўрачыстасць у Гродна прыбылі літаратурныя крытыкі П. Хмялёўскі, артыст М. Катарбінскі, мастак М. Андрыёлі, доктар К. Левакоўскі, этнограф Ян Карловіч. Сярод гасцей, як сведчыла ў пісьме да Карловіча Э. Ажэшка, быў і наш Францішак Багушэвіч, які затрымаўся нават даўжэй за іншых. На жаль, Паўшэр-Кляноўская не называе яго прозвішча. Але, дзякуючы ёй, мы ведаем, з кім ён сустракаўся ў доме Ажэшкі.

Вартыя ўвагі таксама звесткі раздзела «Год 1905». Аказваецца, Ажэшка добра была асвядомлена аб рэвалюцыйных падзеях не толькі ў Гродна і Вільні, але і ў Мінску, Магілёве. Яна абуралася пагромамі, якія там адбываліся. Сама пісьменніца абараняла ад пагрому дзяцей гродзенскіх беднякоў. Цікава, што Ажэшка дала рашучы адпор палескаму магнату Канстанціну Скірмунту, калі ён паведаміў, што выклікаў урадавыя войскі для падаўлення хваляванняў сялян — таму самаму Скірмунту, пра якога з такім сарказмам пісаў у трылогіі «На ростанях» Якуб Колас. У час рэвалюцыі 1905 г. пісьменніца гаварыла Нусбауму, што яе розніць з сацыялістамі пачуццё справядлівасці і брацтва, узаемадапамогі і спачування.

Даследчыка беларуска-польскіх літаратурных сувязей новы твор Паўшэр-Кляноўскай зацікавіць у многіх адносінах. Напрыклад, на старонцы 190 гаворыцца, што ў час юбілею Канапніцкай Ажэшка збірала ахвяраванні нават у Мінску і Магілёве. Значыць, і тут былі сябры дзвюх выдатных польскіх пісьменніц. Хто яны? — пакуль што невядома. У кнізе прыводзяцца звесткі аб прабыванні Ажэшкі ў Мінску, Свіслачы, Панямоні, Фларыянаве, Ракаве. Урэшце рэшт няма патрэбы пералічваць усе гэтыя факты, цікавыя для беларускага чытача. Хочацца спадзявацца, што нашы выдавецтвы зацікавяцца дылогіяй Паўшэр-Кляноўскай. Напісаная жыва і займальна, з навуковай добрасумленнасцю і павагай да беларускага народа, яна заслугоўвае гэтага!

А. МАЛЬДЗІС.

ЯНЫ КАЛЕЧАЦЬ ДЗЯЦЕЙ

РЭПАРТАЖ З ЗАЛЫ СУДА

Клуб камбіната бытавога абслугоўвання запоўнены так, што няма дзе яблыку ўпасці. А народ усё прыбывае.

— Устаць! Суд ідзе, — аб'яўляе народны суддзя тав. Сяргееў.

За сталом—пракурор, засядацелі. На лаве падсудных — дзве яшчэ не старыя жанчыны.

— Разглядаецца справа грамадзянак Івановай і Салдаценка аб пазбаўленні іх права выхоўваць сваіх дзяцей, — паведамляе суддзя.

У зале чуваць цяжкія ўздыхі. З жалем да дзяцей і нянавісцю да іх мацярок паглядаюць людзі на падсудных. Першай разглядаецца справа Івановай.

— Чаму забараняеце дачцы хадзіць на ўрокі фізкультуры?

— Ісус Хрыстос не выломваўся.

— Чаму забараняеце ёй спяваць?

— Бог сказаў: «Калі весела — спявай псалмы», — голас сектанткі прыглушаны, дзікаваты, адказы перасыпаны словамі з бібліі.

— А наогул я не забараняю. Люся сама не хоча. Спытайце, яна сама скажа, — заключае сектантка.

— Люся, устань. У якім класе і як вучышся?

— У чацвёртым. Выдатна.

— Чаму не ўступаеш у піянеры?

— Каб уступіць у піянеры, трэба адрачыся ад бога. А я ведаю, што бог ёсць, ён увайшоў у маё сэрца...

Ціхі Люсін голас аглушае больш, чым гром. Людзі бянтэжацца, устаюць і садзяцца ў хваляванні. Як магло здарыцца, што адзінаццацігадовая дзяўчынка, вучаніца савецкай школы, апынулася ў павуцінні сектантаў?..

На ўскраіне Гарадка па вуліцы Дыдышка ёсць дом № 24. Жыве ў ім сям'я вядомага ў горадзе сектанта-пяцідзесятніка Балабосава. Сам гаспадр з'яўляецца арганізатарам секты. У гэты ціхі закутак збіраюцца сектанты не з аднаго Гарадка, а з Віцебска, Оршы і нават з Літвы. Яны забяспечваюць гарадоцкіх «сясцёр і братоў ва хрысце» рэлігійнай літаратурай і рознымі настаўленнямі. Вось у такой сям'і і расла маленькая Люся. Калі яна сказала першае слова «мама», яе пачалі вучыць другому — «бог». Затым навучылі стаяць на каленях, шаптаць малітвы. Так паступова атручвалася душа дзіцяці.

... Першае верасня 1957 года. Бацькі вядуць дзяцей у першы клас Гарадоцкай сярэдняй школы. Села за парту і Люся. І раптам настаўніца Вера Максімаўна Карашкова пачала заўважаць нешта асаблівае ў Люсі і яе сяброўкі Тані Салдаценка. Яны трымаліся асобна ад іншых, замкнутыя і палахлівыя. Потым здарылася тое, чаго настаўніца не магла пакінуць па-за ўвагай. У школу з'явіўся ўрач, каб зрабіць дзецям уколы супраць інфекцыйных захворванняў. Калі дайшла чарга да Люсі Івановай і Тані Салдаценка, яны наадрэз адмовіліся ад уколаў. Вера Максімаўна вымушана была пайсці да бацькоў.

— Можаце не хвалявацца, — суцешыла настаўніцу маці Тані Ганна Салдаценка. — Мая дачка спазнала бога. і ён беражэ яе ад розных хвароб і няшчасцяў.

І вось дзеці сектантаў па-ранейшаму адмаўляюцца ад медыцынскай дапамогі, пазбягаюць урокаў фізкультуры і спеваў, не ўдзельнічаюць у праўдзенні школьных ранішнікаў, навагодніх вечароў, не чытаюць мастацкай літаратуры. Дзеці пазбаўлены радыё і газет, бацькі забаранілі ім паступаць у піянерскую арганізацыю.

Калектыў школы і раённы аддзел народнай асветы не маглі далей мірыцца з бацькамі, якія калечаць сваіх дзяцей. Пры райвыканкоме была створана спецыяльная апякунская камісія, якая праверыла выхаванне дзяцей у сем'ях сектантаў-пяцідзесятнікаў і паставіла пытанне перад народным судом аб пазбаўленні іх бацькоўскіх праваў.

Пасля Івановай і Салдаценка суд разабраў справу Ганны Анцыбалавай. Гэта яшчэ зусім маладая жанчына, але заблудзілася сама і збівае з правільнага шляху сваіх дзяцей. Калі дачка Тамара ўступіла ў піянерскую арганізацыю, маці паставіла яе на калені адмольваць грахі, забараняе насіць дома чырвоны гальштук. Яе сын-першакласнік Саша разам з усімі дзецьмі радаваўся бяспрыкладнаму палёту Юрыя Гагарына ў космас, а назаўтра прыйшоў у школу сумны.

— Што з табой, Саша? — запытала настаўніца Ніна Ільінічна Шалкоўская.

— А як Гагарын пераляцеў трэцяе неба? Мама казала: на трэцім небе бог...

Сектанцкія погляды Ганны Анцыбалавай доўга цярпеў муж Іван Анцыбалаў. Ён цярпліва тлумачыў жонцы ўсю шкоднасць рэлігійнага дурману. Але нішто не дапамагло. Чатыры месяцы назад ён вымушаны быў пайсці жыць на другую кватэру, сям'я распалася...

З гарачым адабрэннем сустрэлі прысутныя рашэнне суда аб тым, каб Іванову і Салдаценка пазбавіць права выхоўваць дзяцей, уладкаваць Люсю і Таню ў школу-інтэрнат, а дзяцей Ганны Анцыбалавай аддаць на выхаванне бацьку.

П. ВОРАНАЎ,
прапагандыст Гарадоцкага РК КПБ.

РОДНЫЯ КРАЯВІДЫ. Возера Парукава.

Фота **П. Чайкоўскага.**

Падзеі Факты Навіны

● Новы клуб пабудаван на торфапрадпрыемстве «40 год БССР» Гродзенскай вобласці. Акрамя прасторнай глядзельнай залы, у ім ёсць фае, пакоі для бібліятэкі, работы самадзейных гурткоў.

● Паказ фільмаў аб перадавым вопыце ў сельскай гаспадарцы, калгасных маяках добра арганізаван у Пінскім раёне. Толькі за апошнія два месяцы на сяле пастаўлена 285 сеансаў сельскагаспадарчых фільмаў, якія прагледзелі 17.890 чалавек.

У калгасах імя Суворава, «Светлы шлях» перад пачаткам кінасеансаў выступаюць з гутаркамі спецыялісты сельскай гаспадаркі, дзеляцца вопытам перадавікі калгаснай вытворчасці.

● Куставы семінар клубных работнікаў Кобрынскага раёна адбыўся ў вёсцы Навасёлкі. Удзельнікі яго развучылі новыя песні, танцы, гульні.

Куставыя семінары сталі адной з важнейшых форм метадычнай дапамогі раённага Дома культуры кіраўнікам сельскай мастацкай самадзейнасці.

Дзякуючы ініцыятыве работнікаў РДК, значна палепшыўся рэпертуар самадзейных калектываў, актывізавалася іх работа.

● У Мінскай гарадской бібліятэцы, якая носіць імя Янкі Купалы, арганізавана выстаўка, прысвечаная 79-годдзю з дня яго нараджэння. На тэматычнай полцы кнігі Янкі Купалы на беларускай і рускай мовах, крытычная літаратура аб яго творчасці.

У кінатэатры «Цэнтральны» бібліятэка таксама наладзіла выстаўку твораў народнага паэта.

● Апошнюю прэм'еру сезона — камедыю Андрэя Макаёнка «Лявоніха на арбіце» паказаў Вільнюскі акадэмічны тэатр драмы Літоўскай ССР. Пастаноўку ажыццявіў галоўны рэжысёр тэатра, народны артыст Літоўскай ССР Ю. Рудзінскас.

Калектыў тэатра ўключыў новую пастаноўку ў свой гастрольны рэпертуар, з якім ён выязджае ў раёны рэспублікі.

Ашуканцы атрымалі па заслугах

У МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ БССР

Гэтымі днямі калегія Міністэрства культуры БССР разгледзіла факты ашуканства і прыпісак у справаздачах аб рабоце кінасеткі некаторых раённых аддзелаў культуры Мінскай вобласці і Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

Пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва за першы квартал бягучага года Мінскае абласное ўпраўленне культуры прадставіла Міністэрству культуры БССР матэрыялы, у якіх было паказана, што план дэманстрацыі сельскагаспадарчых, навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў перавыканана. Пастановай Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры па гэтых даных Мінскаму абласному ўпраўленню культуры быў прысуджаны ў першым квартале пераходны Чырвоны сцяг.

Праверкай выяўлена, што некаторыя раённыя аддзелы культуры Мінскай вобласці сталі на шлях ашуканства і прыпісак. Напрыклад, у Маладзечанскім раёне было пастаўлена толькі 30 сеансаў, а ў справаздачы паказана, што іх было нібыта — 147, у Капыльскім раёне майстры дутых лічбаў з 33 сеансаў «зрабілі» 128, у Слуцкім раёне з 144—275 сеансаў. У Мінскім раёне, згодна справаздачы, у першым квартале бягучага года было паказана 56 сельскагаспадарчых фільмаў, а на самай справе яны зусім тут не дэманстраваліся.

Такія факты прыпісак і ашуканства мелі месца і ў Бярозаўскім раённым аддзеле культуры, якому незаслужана за першы квартал гэтага года была прысуджана другая грашовая прэмія Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры, а таксама пераходны Чырвоны сцяг Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры і абкома прафсаюза работнікаў культуры.

Калегія Міністэрства культуры БССР асудзіла гэтыя абураючыя факты. Майстры прыпісак і ашуканства атрымалі суровыя спагнанні.

За запушчанасць ва ўліку работы кінасеткі ў аддзеле кінафікацыі Мінскага абласнога ўпраўлення і ў раённых аддзелах культуры і прыпіскі ў справаздачнасці за першы квартал гэтага года намесніку начальніка абласнога ўпраўлення С. Семяненку аб'яўлена строгая вымова. Вымова аб'яўлена намесніку загадчыка Бярозаўскага раённага аддзела культуры Брэсцкай вобласці В. Бобелю і бухгалтару аддзела Е. Сялькоўскай.

Загадам міністра культуры БССР вінаватыя ў прыпісках абавязаны вярнуць у даход дзяржаўнага бюджэта незаконна атрыманыя прэміі.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

Друкарня імя Сталіна.

АТ 03633.